КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 32 (208) ◂ 10 верасня ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час

ISSN 2218-2144




**БЮДЖЭТ ПРЫМАЮЦЬ АЎРАЛАМ**

Стар. 4

**НЕБА Ў СМУЗЕ**

Нават тыя, хто лічыў, што прыватнік краіну не накорміць, былі змушаныя ствараць умовы для існавання падсобных гаспадарак

Стар. 5

**ПАДАРУНАК АД ТЭРАРЫСТАЎ**

На 50-ю гадавіну свайго дня нараджэння ЕТА — арганізацыя прыхільнікаў незалежнасці Краіны Баскаў — зрабіла іспанцам сюрпрыз

Стар. 12

**МЕРА АДКАЗНАСЦІ**

Стар. 14

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**ЭЛЕКТРЫЧНЫЯ ГІСТОРЫІ ІСТЭРЫЧНЫХ ІДЭЙ**

Нарыс Андрэя Расінскага

▸ **З НАГОДЫ**

# СПРОБА ЗАПАЛОХАЦЬ

Генадзь КЕСНЕР

**Незразумелая смерць заснавальніка і кіраўніка вядомага ў Беларусі і ў свеце інтэрнэт-сайта «Хартыя–97» Алега Бябеніна, а таксама пісьмовая пагроза на адрас намесніка галоўнага рэдактара незалежнай газеты «Народная воля» Святланы Калінкінай прымушаюць зрабіць выснову, што пэўныя сілы спрабуюць запалохаць незалежных беларускіх журналістаў напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў.**



Гібель Бябеніна ўжо выклікала шырокі розгалас ва ўсім свеце, кіраўнікі замежных дыпламатычных ведамстваў і міжнародных арганізацыяў патрабуюць ад афіцыйнага Мінска правесці празрыстае і аб'ектыўнае расследаванне абставін і прычын смерці журналіста.

Алега Бябеніна хавалі ў панядзелак на Усходніх могілках Мінску. Развітацца з ім прыйшлі сотні людзей — шматлікія журналісты айчынных і замежных СМІ,палітыкі і грамадскія дзеячы, вядомыя ў краіне людзі сярод якіх былі экс-старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі 12-га склікання Станіслаў Шушкевіч, кіраўнік Руху «За свабоду» Аляксандр Мілінкевіч, лідэр грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду!» Уладзімір Някляеў. Мора кветак і вянкоў. І неразуменне таго, што ж насамрэч здарылася ў загарадным доме Алега ў вёсцы Пярхурава Дзяржынскага раёна.

Туды Алег скіраваўся яшчэ 2 верасня на ўласным аўтамабілі. Вечарам таго ж дня журналіст планаваў з сябрамі пайсці на прэм'еру ў кінатэатр «Кастрычнік», праз што свёдчылі апошнія смс-паведамленні з Алегавага тэлефона. Потым сувязь з ім спынілася, ён перастаў адказваць на тэлефанаванні. 3 верасня занепакоеная жонка Бябеніна папрасіла сваю сястру, каб тая з'ездзіла ў вёску і паглядзела, што да чаго. Што ўбачылі людзі ў Пярхураве, добра вядома…

Алега Бябеніна знайшлі ў пятлі, прымацаванай да лесвіцы, што вядзе на другі паверх дома. Па словах прадстаўнікоў праваахоўных органаў, на шыі журналіста было толькі странгуляцыйная баразна, ніякіх іншых пашкоджанняў на целе быццам бы не было. Як і не было слядоў барацьбы ў самой хаце. Толькі дзве пустыя пляшкі ад «Беларускага бальзаму».

Вось тут у блізкіх і сяброў загінулага пачалі ўзнікаць пытанні. Па словах патэнцыйнага кандыдата ў прэзідэнты Андрэя Саннікава, які быў адным з першых, хто з'явіўся на месцы трагедыі, Бебенін чалавек знаходзіўся практычна на нагах, на адной руцэ ў яго была заўважана сцёртая драпіна. Калега Саннікава Зміцер Бандарэнка дадаў, што адна нага Алега была моцна вывернутая, што магло б мець месца, калі б той скочыў з вышыні. Але, па словах Саннікава, на лесвіцы, якая вяла на другі паверх, нельга было нават нагу паставіць, столькі там было розных рэчаў.

Да таго ж, нават судмедэкспертамі і следчымі было засведчана, што смерць наступіла ў выніку «мяккага ўдушэння». Але калі б журналіст скочыў з пятлёй на шыі, то ў яго былі б зламаны шыйныя пазванкі, але гэтага спецыялісты не зафіксавалі. Што да пустых пляшак, то, паводле сяброў Алега, ён бы не стаў піць бальзам нават пад пісталетам, бо папросту не любіў і не ўжываў такіх напояў, аддаваў перавагу віскі. І галоўнае, што адзначаюць амаль усе, гэта адсутнасць матыву для самагубства.

У Бябеніна, па словах рэдактара сайту «Хартыя–97» Наталлі Радзінай, на бліжэйшыя дні быў запланаваны шэраг сустрэч, Алег быў поўны планаў, толькі тыдзень таму ён вярнуўся з Грэцыі, дзе быў у адпачынку з сям'ёй. Любіў жонку і асабліва малодшага пяцігадовага сына. Увогуле быў паспяховым і жыццярадасным чалавекам. І такі сам палезе ў пятлю? Вельмі сумнеўна.

Гэты сумнеў яшчэ 5 верасня ў сваім блогу асэнсоўвала вядомая журналістка Святлана Калінкіна ў артыкуле «Пятля». Журналістка не выключае, што Алег Бябенін мог стаць ахвярай барацьбы розных цэнтраў уплыву ў сілавых структурах, калі «новыя фігуры, якія занялі ключавыя пасады ў сілавых ведамствах і якім было даверана кантраляваць практычна ўсё, згубілі галовы ад усёдазволенасці». Яшчэ не паспелі пахаваць Алега, як невядомыя кінулі ў паштовую скрыню Святланы паштоўку з пагрозай фізічнае расправы, калі яна напіша «яшчэ адзін такі артыкул». Здарэнне з Бябеніным і пагрозы Калінкінай, як і ўзмацненне ціску на шматлікіх незалежных журналістаў і недзяржаўныя выданні, вымушаюць рабіць высновы пра спробы запалохаць журналісцкую супольнасць напярэдадні найважнейшай электаральнай кампаніі пяцігодкі.

Эксперт Аналітычнага цэнтру «Стратэгія» Валеры Карбалевіч адзначае, што пытанняў у гісторыі з Алегам Бябеніным застаецца вельмі шмат. «Напярэдадні выбараў, калі ўлады не могуць адмыцца ад абвінавачанняў у прыналежнасці да знікненняў апазіцыйных палітыкаў, ва ўмовах вострай інфармацыйнай вайны з Расіяй палітычнаму кіраўніцтву гэты галаўны боль наўрад ці патрэбен. Падсумоўваючы факты, можна вельмі сур'ёзна паставіцца да версіі, выказанай Святланай Калінкінай, што ў стасунках Аляксандра Лукашэнкі са сваімі спецслужбамі нешта не тое… Гэта непрафесіяналізм ці нешта іншае? Ці кантралюе іх прэзідэнт? Ці яны вядуць сваю ўласную, аўтаномную, не да канца зразумелую гульню?» — задаецца пытаннем аналітык.

Дагэтуль улады не далі адказ на пытанні, дзе апаратар тэлеканалу ОРТ Дзмітрый Завадскі, які знік летам 2000 года, і што з ім насамрэч здарылася. Не раскрытыя забойствы журналістаў Веранікі Чаркасавай і Васіля Гроднікава, хаця ўжо мінула шмат гадоў з тых трагедый. І вось цяпер Алег Бябенін…

Адсутнасць яснасці ў гэтых пытаннях не надае гонару кіраўнікам дзяржавы. А тым часам правесці аб'ектыўнае і празрыстае расследаванне гібелі Алега Бябеніна ад уладаў патрабуюць прэзідэнт Еўрапарламента Ежы Бузэк, дакладчык Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы Сінікa Хурскайнен, міністэрствы замежных спраў шэрагу еўрапейскіх краін. Адкрыты ліст з нагоды гібелі журналіста 8 верасня распаўсюдзілі прадстаўнікі «трэцяга сектару» Беларусі — удзельнікі Форуму грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства. Заяву з нагоды гібелі журналіста ў гэты ж дзень зрабілі ўдовы зніклых Анатоля Красоўскага Ірына і Дзмітрый Завадскага Святлана, якія таксама не вераць у самагубства Алега Бябеніна.

Зараз працягваецца судова-медычная экспертыза, вынікі якой абяцаюць давесці да ведама грамадскасці не пазней як праз месяц.

ЗАКЛІК

# АСАМБЛЕЯ ЗА АБ'ЯДНАННЕ

**Асамблея дэмакратычных няўрадавых арганізацый Беларусі, у складзе якой каля 280 грамадскіх аб'яднанняў, прыняла заяву адносна сітуацыі раз'яднанасці ў дэмакратычных палітычных колах напярэдадні выбарчай прэзідэнцкай кампаніі.**

Старшыня Рабочай групы Асамблеі НДА Сяргей Мацкевіч паведаміў: «Заява адрасаваная шырокай аўдыторыі: патэнцыйным кандыдатам у прэзідэнты, лідэрам палітычных партыяў і рухаў. Але, у першую чаргу, тым актывістам грамадскага і палітычнага сектараў, якія зацікаўленыя ў дэмакратычных пераменах у Беларусі». Дакумент ухвалілі сябры Рабочай групы Асамблеі НДА, у склад якой уваходзяць прадстаўнікі найбольш уплывовых грамадскіх аб'яднанняў Беларусі.

«Мы, прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці Беларусі, глыбока занепакоеныя сітуацыяй у дэмакратычных палітычных колах краіны напярэдадні выбарчай прэзідэнцкай кампаніі. Раз'яднанасць дэмакратычных прэтэндэнтаў на пасаду прэзідэнта краіны, няздольнасць вызначыць адзінага кандыдата, адсутнасць у іх супольных стратэгічных мэтаў і распрацаванага плану дзеянняў ставяць пад сумнеў сур'ёзнасць іх намераў», — гаворыцца ў заяве.

Сябры Рабочай групы ад імя дэмакратычнай грамадзянскай супольнасці паабяцалі прыняць «чынны ўдзел у інфармаванні, актывізацыі, арганізацыі беларускага грамадства напярэдадні выбараў дзеля дасягнення правоў і свабод і адбудовы дэмакратычнага ладу».

Таксама ў заяве адзначаецца ўстрывожанасць адсутнасцю ў дэмакратычным лагеры ўзгодненага стаўлення да рэжыму і будучыні Беларусі. У сувязі з паўсталымі напярэдадні выбараў праблемамі сябры Рабочай групы Асамблеі НДА заклікаюць палітычных дэмакратычных лідэраў да стратэгічнага і практычнага аб'яднання.

«Дадзеная заява — гэта, можна сказаць, пазіцыя пэўнай часткі грамадскага сектару Беларусі, інтарэсы якой рэпрэзентуе Асамблея НДА. Спадзяемся, палітычныя лідэры з ліку патэнцыйных кандыдатаў усё ж такі ўлічаць меркаванне неабыякавых беларусаў, задзейнічаных у працы аб'яднанняў трэцяга сектару. Грамадзянская супольнасць Беларусі не можа заставацца ў баку ад вызначальных палітычных падзеяў, таму мы вырашылі данесці наш погляд на наяўную перадвыбарчую сітуацыю», — рэзюмаваў старшыня Рабочай групы Асамблеі НДА і спікер Форуму грамадзянскай супольнасці усходняга партнёрства Сяргей Мацкевіч.

**Паводле прэс-рэліза Асамблеі НДА**

ДАТА

# ДЗЕНЬ САЛІДАРНАСЦІ ЖУРНАЛІСТАЎ

**8 верасня ўвесь цывілізаваны свет адзначае Міжнародны дзень салідарнасці журналістаў. З гэтай нагоды Беларуская асацыяцыя журналістаў прыняла адмысловую заяву.**

«Гэту дату заснавала ў 1958 годзе Міжнародная арганізацыя журналістаў у памяць пра свайго чэшскага калегу Юліуса Фучыка, закатаванага гітлераўцамі 8 верасня 1943 года. Яго неўміручыя словы перасцярогі — «Людзі, будзьце пільныя!» — сёння гучаць для нас, беларускіх журналістаў, асабліва актуальна. Бо пагрозы, з якімі мы сутыкаемся, апошнім часам робяцца ўсё больш рэальнымі і жорсткімі», — гаворыцца ў заяве.

«Днямі мы страцілі Алега Бябеніна. Гэта смерць, як і смерці нашых калег Дзмітрыя Завадскага, Веранікі Чаркасавай, Васіля Гроднікава, пакідае больш пытанняў, чым адказаў. А тыя, хто пачынае шукаць гэтыя адказы, самі рызыкуюць жыццём. Гэтак, пасля апублікавання артыкулу «Пятля» з версіямі наконт прычын гібелі Алега Бябеніна нашай калезе Святлане Калінкінай адразу ж сталі пагражаць расправай.

Мэта гэтых брутальных і беспакараных дзеянняў — задушыць любое іншадумства. Спалохацца і замаўчаць — значыць пагадзіцца з роляй паслухмяных статыстаў, у якой хацелі б бачыць журналістаў цемрашалы і злачынцы. Але маўчанне не гарантуе бяспеку», — падкрэслівае БАЖ.

«Быць пільнымі — значыць бачыць, што адбываецца, і не маўчаць. Быць салідарнымі — значыць быць неабыякавымі адзін да аднаго і гатовымі прыйсці на дапамогу. Толькі так мы здолеем адстаяць свае правы на прафесію і на жыццё. Будзем пільнымі. Будзем салідарнымі. Будзем разам!» — заклікаюць аўтары заявы.

**Паводле інфармацыі БАЖ**

ПРАЕКТ

# ПЕРШЫ СЕЗОН

**Сяргей ІВАННІКАЎ**

**У Барысаве завяршыліся здымкі першага сезона (12 серый) тэлевізійнага шматсерыйнага фільма «Школа», створанага на базе мясцовай тэлекампаніі «Скіф» у рамках «Міжнароднага сацыяльна-культурнага праекта па развіццю рэгіянальнага тэлебачання «Школа».**

Праца над кінастужкай пачалася яшчэ летам 2008 года. У красавіку 2009 года тэлекампанія «Скіф» ажыццявіла здымкі чатырох серый, а з 15 сакавіка па 31 ліпеня гэтага года яшчэ васьмі.

Падзеі фільма адбываюцца дзесьці на постсавецкай прасторы ў невялікім гарадку Запольску. У цэнтры ўвагі — школа, галоўныя героі — старшакласнікі. Гісторыя пра каханне, сяброўства, патрыятызм, асэнсаванне сябе і свайго месца ў гэтым складаным свеце.

Амаль усе ролі выконваюць акцёры барысаўскіх аматарскіх тэатраў «Трыумф», «Відарыс» і «Людзі добрыя». Ролю начальніка міліцыі Запольска — заслужаны артыст Беларусі Сяргей Журавель, супрацоўніка спецслужбы — акцёр Сяргей Шароў. Фільм здымалі прафесійныя аператары: Вячаслаў Макар'еў (Расія), Андрыс Прыедзіціс (Латвія), Андрэй Васкрасенскі і Аляксандр Мароз (Беларусь). Рэжысёры серыяла — Сяргей Сергіенка і Кацярына Янушэўская. Сцэнарысты — Ганна Авота, Сяргей Сергіенка і Кацярына Янушэўская, мастак-пастаноўшчык — Ігар Куніцкі. Навучэнне па грыме і візажу праводзілі мастакі па грыму кінастудыі «Беларусьфільм» пад кіраўніцтвам Людмілы Сярогінай. Прадзюсеры фільма — Сяргей Кузёменскі і Наталля Голава. Як і ў любым кіно, у гэтым серыяле ёсць музыка. Яе аўтары — беларускія, латвійскія, ізраільскія і англійскія кампазітары.

Прэзентацыя першага сезона тэлевізійнага шматсерыйнага фільма «Школа» плануецца восенню на беларускіх рэгіянальных тэлеканалах, а таксама на лакальным тэлебачанні ў Расійскай Федэрацыі і Украіне.

СУД

# СПРАВУ ПЕРАГЛЕДЗЯЦЬ

**Язэп ПАЛУБЯТКА**

**Суддзя абласнога суда Эдуард Друц адмяніў рашэнне Астравецкага раённага суда адносна актывіста АГП Івана Крука і накіраваў справу на перагляд.**

Згодна з рашэннем Астравецкага раённага суда, актывісту Івану Круку быў прызначаны штраф 1 мільён 50 тысяч рублёў нібыта за паклёп на намесніка старшыні райвыканкаму Міхаіла Зімніцкага.

Падчас выбарчай кампаніі ў мясцовыя саветы Іван Крук напісаў скаргі ў пракуратуру і абласную выбарчую камісію, у якіх сведчыў, што намеснік старшыні райвыканкаму Зімніцкі, які быў намеснікам старшыні раённай выбарчай камісіі, сфабрыкаваў падпісныя лісты з тым, каб не зарэгістраваць Крука кандыдатам у дэпутаты.

У прыватнасці Крук даводзіў, што Міхаіл Зімніцкі наведаўся дадому да аднаго з выбарцаў, якога прымусіў пад пагрозай праблемаў на працы падпісаць дакумент, у якім гаварылася, што той не ставіў свайго подпісу за вылучэнне Крука кандыдатам у дэпутаты.

Раённы суд, разглядаючы справу, нават не палічыў патрэбным выслухаць на сваім пасяджэнні галоўнага сведку, які б мог сам даць паказанні наконт таго, ці ставіў ён свой подпіс за Крука. Не была праведзеная і экспертыза подпісу, які палічылі фальшывым.

Іван Крук у абласным судзе цытаваў скаргу выбарца Мацкевіча ў Генеральную пракуратуру, а таксама ў абласны суд, у якой той сведчыць, што подпіс за Крука ставіў, а Зімніцкі пад пагрозай праблемаў на працы насамрэч прымусіў яго падпісаць паперу, дзе казалася пра тое, што ён не падпісваўся за Івана Крука.

Крук цытаваў і ліст сведкі, якая пацвярджае, што бачыла, як Мацкевіч ставіў свой подпіс за вылучэнне Крука кандыдатам у дэпутаты.

Яшчэ ў абласным судзе цытаваўся ліст 30 грамадзян Астравецкага раёна з просьбай разглядзець справу Крука аб'ектыўна, паколькі людзі ведаюць яго ў раёне як прыстойнага чалавека, за якога ставілі свае подпісы падчас вылучэння яго кандыдатам у раённы савет.

Аднак тады суддзя Астравецкага раёна не палічыўся з гэтымі аргументамі. А што будзе зараз?

ПЕРАПІС

# НЕ КАТАСТРОФА, АЛЕ ПАГРОЗА

**Алена ВАРАЖБЕЙ**

**Беларускую мову лічаць роднай 53 працэнты жыхароў краіны. Такую лічбу агучыў Нацыянальны статыстычны камітэт, які падвёў вынікі перапісу насельніцтва ў кастрычніку 2009 года.**




«Асноўнай мовай, якую выкарыстоўваюць для зносінаў, з'яўляецца руская мова, — паведаміла на прэсканферэнцыі 8 верасня намеснік старшыні Нацыянальнага статыстычнага камітэта Алена Кухарэвіч. — На ёй звычайна размаўляе дома 6 мільёнаў 673 тысячы чалавек (70 працэнтаў насельніцтва краіны). Беларускую мову выкарыстоўваюць для зносінаў 2 мільёна 227 тысяч чалавек (ці 23 працэнта насельніцтва краіны)».

Нагадаем, што падчас перапісу 1999 года беларускую мову назвалі роднай 73,7 працэнта беларусаў.

Кіраўнік Таварыства беларускай мовы Алег Трусаў лічыць, што галоўную адмоўную ролю адыгралі дзве прычыны. «Не трэба забываць, што ў нас дэмаграфічная трагедыя, — адзначыў ён. — За 10 гадоў паглядзіце, наколькі менш людзей стала. І ў першую чаргу вымерлі тыя дзяды, якія гаварылі па-беларуску. А самае галоўнае — 10 год татальнай русіфікацыі».

Да таго ж, нагадваюць крытыкі, яшчэ напярэдадні перапісу яны ўказвалі на «некарэктнасць» фармулёўкі пытання пра родную мову. Бо ў перапісных лістах у дужках ішла расшыфроўка гэтага паняцця — «мова, засвоеная першай у раннім дзяцінстве». То бок, калі зараз чалавек размаўляе выключна па-беларуску, а ў дзяцінстве не размаўляў, ён не можа назваць беларускую мову роднай.

«Я думаю, што гэта таксама было не на нашу карысць, — лічыць Алег Трусаў. — Як і тое, што перапісчыкі задавалі пытанні ў асноўным па-руску. І хаця сітуацыя не катастрафічная, але пагражальная. Калі ўлічваць поўную непавагу да мовы з боку кіруючых чыноўнікаў, татальную русіфікацыю сродкаў масавай інфармацыі, асабліва тэлевізіі, то вынікі адносна някепскія».

Прадстаўнікі Нацыянальнага статыстычнага камітэта таксама адзначылі, што па дадзеных перапісу–2009 на тэрыторыі Беларусі пражывала каля 140 нацыянальнасцяў і народнасцяў. Амаль 84 працэнта жыхароў краіны аднеслі сябе да карэннай нацыянальнасці — беларусаў, 8 — да рускіх, 3 працэнта — да палякаў, каля двух працэнтаў — да ўкраінцаў і 0,1 працэнта — да яўрэяў. Гэта пяць найбольш шматлікіх нацыянальных групаў.

Колькасць насельніцтва ў Беларусі падчас правядзення перапіснай кампаніі склала 9 мільёнаў 504 тысячы чалавек. 0,3 працэнта беларусаў (28 тысяч чалавек) катэгарычна адмовіліся прайсці перапіс насельніцтва.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ВОСЕНЬСКІЯ РАСЧАРАВАННІ



Photo.ByMedia.Net

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Здаецца, толькі пайшоў другі тыдзень восені, але гэта восень ужо не спраўджвае надзеі беларусаў. З рэзкай зменай надвор'я шмат нашых суайчыннікаў пачало злёгку хварэць, «саплівець» і скардзіцца на здароўе. І ніякіх падзеяў, якія б прымусілі іх больш актыўна працаваць (а, як вядома, больш актыўны і працавіты чалавек менш хварэе), пакуль што не назіраецца.**

У першую чаргу расчаравала пазачарговая сесія Палаты прадстаўнікоў. Шмат хто не верыў у тое, што яна сур'ёзна склікана для абмеркавання бюджэту. Чакалася, што 7 верасня будзе дадзены старт прэзідэнцкім выбарам, і народныя выбраннікі назавуць, урэшце, дату выбараў. Шмат хто на гэта спадзяваўся, паколькі на пасяджэнні дэпутатаў прысутнічала старшыня Цэнтрвыбаркаму Лідзія Ярмошына.

Аднак гэтага не адбылося. Грамадства па-ранейшаму знаходзіцца ў стане «поўнай баявой гатоўнасці», але адмашка «на старт» усё затрымліваецца і затрымліваецца. Найбольш моцныя трэніруюць нервы, як, прыкладам Някляеў, які не кажа ні «так», ні «не» з нагоды фармату ўдзелу кампаніі «Гавары праўду!» у прэзідэнцкай гонцы. У найменш моцных нервы здаюць, як у Аляксандра Мілінкевіча, які адным з першых заявіў пра свой намер стаць прэзідэнтам Беларусі, але зараз вагаецца і выстаўляе «палатцы» ўмовы зменаў выбарчага заканадаўства.

Дарэчы, абмеркавання прапаноў Мілінкевіча па зменах Выбарчага кодэкса, якія б давалі кожнаму кандыдату ў прэзідэнты права вылучаць сваіх прадстаўнікоў у выбарчыя камісіі ўсіх узроўняў, на пасяджэнні дэпутатаў таксама не абмяркоўвалася. І калі, у сувязі з непрыняццем ягоных прапаноў, Мілінкевіч адмовіцца ад удзелу ў выбарах (магчымасць гэтага ўжо абмяркоўваецца ў прэсе), думаю, «палатка» з гэтага смуткаваць не будзе. Можа, наадварот, пацісне яму руку і скажа «Бывай, Саша!» (выбачайце за каламбур).

Але расчараваныя не толькі тыя, хто гатовы па першаму свістку стартануць на змаганне за галасы выбаршчыкаў. Расчараванне атрымалі людзі, якія, па ідэі, павінны забяспечыць бюджэт не толькі выбарчай кампаніі, але і Беларусі ўвогуле.

Міжнародныя рэзервовыя актывы (золатавалютныя рэзервы) Беларусі, разлічаныя па стандартах МВФ, скараціліся ў студзені—жніўні на 83,1 мільёна долараў, ці на 1,5%, і на 1 верасня склалі 5 мільярдаў 569,4 мільёна долараў ЗША. Як паведамілі ў Нацыянальным банку, за жнівень золатавалютныя рэзервы, разлічаныя па методыцы МВФ, выраслі на 237,4 мільёна долараў (4,5%).

Пры гэтым варта ўлічваць, што ў жніўні ў Беларусь паступіў 1 мільярд долараў ЗША ад размяшчэння дэбютнага выпуску еўрабондаў, які быў накіраваны на папаўненне золатавалютных рэзерваў. Калі б не гэтыя аблігацыі, рэзервы ўпалі б на рэкордную суму — 762 мільёна за месяц.

І гэта яшчэ не ўсё. Еўрабонды еўрабондамі, але іх трэба будзе выкупляць. То бок, аддаваць грошы з працэнтамі. А пакуль выкупляць іх няма за што, і новых паступленняў не прадбачыцца. Калегія Эканамічнага суда СНД 7 верасня адхіліла хадайніцтва беларускага боку аб часовай адмене вывазных мытных пошлін на нафтапрадукты, якія пастаўляюцца з Расіі ў Беларусь.

Падчас судовага разгляду Расія прапанавала Беларусі выпрашыць спрэчку аб збіранні мытных пошлін на нафтапрадукты ў пазасудовым парадку. Суд задаволіў хадайніцтва расійскага боку. У сваю чаргу беларускі бок заявіў пра гатоўнасць выпрашыць спрэчку ў пазасудовым парадку, але з пэўнай умовай. У прыватнасці, была прапанавана часовая забарона на збіранне вывазных мытных пошлін на нафтапрадукты, якія пастаўляюцца ў Беларусь. Аднак адпаведнае хадайніцтва суд адхіліў.

Наступнае пасяджэнне калегіі Эканамічнага суда СНД прызначана на 7 кастрычніка. Суд выказаў пажаданне, каб за гэты час бакі прыйшлі да міравога пагаднення.

То бок, суд нічога не выпрашыў, сказаўшы: «Пакуль паспрабуйце разабрацца самі». Але ўсе папярэднія спробы «разабрацца самім», як вядома, скончыліся праваламі. І наўрад ці новыя перамовы чакае іншы лёс.

Не пашанцавала і нашым арганізатарам спартыўных мерапрыемстваў. Але на гэты раз свінню ім падклалі французы. На пазнейшы тэрмін перанесена запланаванае на 8 верасня падпісанне кантракта паміж Еўрапейскім саюзам гімнастыкі (UEG) і Беларускай асацыяцыяй гімнастыкі аб правядзенні ў 2011 годзе ў Мінску чэмпіянату Еўропы па мастацкай гімнастыцы.

У сувязі з забастоўкай французскіх транспартнікаў, якія пратэстуюць супраць пенсійнай рэформы, на цырымонію з Парыжа не змог прыбыць прэзідэнт UEG, іх суайчыннік Жорж Гельзек. Новая дата мерапрыемства, якое прадугледжвала таксама прэс-канферэнцыю кіраўніцтва UEG, БАГ і Мінспорту, будзе аб'яўлена пазней. Пэўна, тады, калі ў Францыі скончыцца агульнанацыянальны страйк.

А яшчэ на тыдні мы сутыкнуліся з тым, чаго не адчувалі з так званых «ліхіх 90-х». Менавіта — з дэфіцытам. Напачатку восені з прылаўкаў крамаў раптоўна знік адзін з самых папулярных і, можна сказаць, «нацыянальных» прадуктаў Беларусі — грэчка. З пачатку верасня па гандлёвых прадпрыемствах Мінска, грэцкіх крупаў не было ні ў магазінах сеткі «Рублёўскі», ні ў гіпермаркетах «Гіпа», «Бігз», «Карона». Не парадавалі прысутнасцю крупы таксама і крамы, якія не ўваходзяць ні ў якія сеткі. Карацей, грэчка знікла.

Паводле слоў спецыялістаў, дэфіцыт грэцкіх круп у гандлёвай сетцы Беларусі звязаны з ажыятажным попытам, падагрэтым навінамі з Расіі і Украіны. Там гэты прадукт падаражэў у два-тры разы. Як паведамілі прадстаўнікі кампаній — аптовых пастаўшчыкоў круп «Ракан — Крупяны дом» і «Святлара», яны заключылі кантракты з вытворцамі круп у Беларусі і Расіі, і праз тыдзень-два яны пачнуць паступаць у гандлёвую сетку. Але, як адзначылі спецыялісты, кошт на грэцкія крупы таксама ўзрасце і ў нас. Можна чакаць, што кіло грэчкі будзе каштаваць каля васьмі тысяч беларускіх рублёў.

Можа, таму і нас пазбавілі свята? Рэспубліканскі фестываль-кірмаш «Дажынкі-2010» пройдзе ў Лідзе 24–26 верасня, хаця раней планавалася правесці «Дажынкі» 17–19 верасня. Традыцыйна на фестывалі будуць адзначаць дасягненні пераможцаў рэспубліканскіх спаборніцтваў па ўборцы ўраджаю зерневых і зернебабовых культур, нарыхтоўцы травяных кармоў, вырошчванні лёну і па вытворчасці жывёлагадоўчай прадукцыі. А якое тут свята, калі грэчкі няма?

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### НАДЗЕЯ АСТАПЧУК



Штурхальніца ядра Надзея Астапчук заваявала срэбра на Кубку кантынентаў, які праходзіў у харвацкім Спліце. Лідэр сусветнага сезону, чэмпіёнка Еўропы–2010, залатая медалістка зімовага чэмпіянату свету–2010 і пераможца Дыяментавай лігі Надзея Астапчук, якая прадстаўляла Еўропу, не здолела абыйсці сваю галоўнай канкурэнтку Валеры Адамс-Вілі з Новай Зеландыі.

У лепшай спробе беларуска адправіла снарад на 20,18 метра. Новазеландка ж нават у горшым сваім падыходзе штурхнула ядро далей (20,56 метра). А ў лепшай спробе снарад паляцеў на адзнаку 20,86 метра. Але да лепшага выніку сезону, паказанага Надзеяй Астапчук 26 чэрвеня ў Гродна (20,95 метра), Валеры Адамс-Вілі не дацягнула. Бронзавым прызёрам Кубка кантынентаў стала кітаянка Ліцзяо Гон — 20,13 метра.

Такім чынам, Валеры Адамс-Вілі і Ліцзяо Гон дадалі ў скарбонку зборнай Азіі/Акіяніі 14 балаў, Надзея Астапчук запісала на рахунак Еўропы 7 балаў. У выніку зборная Еўропы, якая складалася з 92 спартоўцаў з 23 краін, стала ўладальніцай Кубка кантынентаў. У камандным заліку па выніку 40 відаў еўрапейскія атлеты набралі 429 балаў. На рахунку Амерыкі — 419,5 бала, Афрыкі — 292, Азіі/Акіяніі — 286,5.

Кубак кантынентаў, у якім змагаюцца зборныя Еўропы, Амерыкі, Афрыкі і Азіі/Акіяніі, праводзіцца ўпершыню. Ён прыйшоў на змену Кубку свету.

### КАЦЯРЫНА НІКАНДРАВА



Культурнае жыццё сталіцы ўскалыхнуў 2-гі конкурс жаночай прыгажосці «Міс грудзі Беларусі». Паглядзець на хараство канкурсантак у клуб «Тытан» прыйшоў не адзін дзесятак мужчын. Для конкурсу з 87 прэтэндэнтак былі абраныя 10 удзельніц — рознай фактурнасці, аб'ёмаў, нораваў і здольнасцяў.

Сярод адборачных конкурсаў былі дэфіле ў бікіні, эратычны танец, абліванне сябе вадкасцю. Па выніках галасавання журы, тытул «Міс грудзі Беларусі» заваявала бландынка з 5-м памерам грудзей Кацярына Нікандрава, другое месца дасталася брунетцы Алёне Церах, а «бронзу» атрымала ізноў-такі бландынка Ірына Рослік.

Відавочна, публіка начнога клубу не была цалкам задаволеная відовішчам, бо не ўсе фіналісткі наважыліся агаліцца. Хаця развязанасці і безгустоўнасці хапала з лішкам. Да слова, леташні першы конкурс «Міс грудзі Беларусі» выклікаў няма спрэчак — удзельніц і арганізатараў абвінавачвалі ў нізкай культуры і заняпадзе маральнасці. Але ж попыт нараджае прапановы.

### УЛАДЗІМІР НЯКЛЯЕЎ

Паэт і лідэр кампаніі «Гавары праўду!» Уладзімір Някляеў нарэшце публічна заявіў, што мае намер прыняць удзел у бліжэйшых прэзідэнцкіх выбарах. «Фармальна на сённяшні дзень я не з'яўляюся прэтэндэнтам у прэзідэнты. Але рэальна гэта здарыцца, як толькі будуць абвешчаныя прэзідэнцкія выбары», — сказаў у эфіры перадачы «Разварот» на радыё «Эхо Москвы» Някляеў.

Цяпер у стане апазіцыі актыўна абмяркоўваюцца варыянты таго, хто з патэнцыйных прэтэндэнтаў на ўдзел у выбарчай гонцы здыме сваю кандыдатуру на карысць Някляева ды пагодзіцца працаваць на яго перамогу. «Я якраз з'яўляюся тым чалавекам, які спрабуе і зараз удзельнічаць ва ўсіх працэдурах па вылучэнні адзінага кандыдата. Я ў гэтым зацікаўлены, таму што ў той сітуацыі, якая прамалёўваецца, выбараў саміх, вельмі цвёрдай сітуацыі, адзіны кандыдат неабходны не толькі дзеля адзінства апазіцыі, ён неабходны грамадству як чалавек, які будзе прымаць у той няпростай сітуацыі рашэнне. І тут ніяк два або тры генералы на гэтым полі недарэчныя. Вось асноўная задача, якую я бачу для таго, каб менавіта вырашыць пытанне з адзіным кандыдатам», — акрэсліў сваю пазіцыю Някляеў.

Намеры Някляева балатавацца на пасаду прэзідэнта выдавала не толькі яго актыўная грамадская дзейнасць, паездкі па рэгіёнах, але і адпаведная знешняя рэклама. Так, на беларуска-расійскай мяжы ўжо стаяць білборды з выявай Някляева і надпісам :«Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. Артыкул 87. Прэзідэнт у любы час можа падаць у адстаўку». Хто і як будзе кіраваць краінай у пераходны перыяд?». Тут жа падаецца адказ: «Уладзімір Някляеў».



ПАЛАТА

# БЮДЖЭТ ПРЫМАЮЦЬ АЎРАЛАМ

Вольга ХВОІН

**Палата прадстаўнікоў на пазачарговай сесіі прыняла ў першым чытанні законапраект «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2011 год», паводле якога бюджэт наступнага года будзе дэфіцытным на шэсць трыльёнаў рублёў.**




## Цёмны газ

На пазачарговай сесіі Палаты прадстаўнікоў Беларусі не быў прызначаны дзень наступных прэзідэнцкіх выбараў, хаця менавіта гэтага чакалі палітолагі. Працоўны час парламентарыі прысвяцілі бюджэтным пытанням краіны. Дэпутаты зацвердзілі праект бюджэту–2011 з прыбыткамі ў памеры 54,5 трлн. рублёў, а выдаткамі — 60 трлн. рублёў. Дэфіцыт запланаваны ў 6 трлн. рублёў, або 3% ад валавога ўнутранага прадукту.

Цікава, што, зацвярджаючы бюджэт, парламентарыі дакладна не ведалі аднаго з важных фактараў уплыву на эканоміку — коштаў на газ у наступным годзе. Міністр фінансаў Беларусі Андрэй Харкавец не выключае «досыць высокага» росту кошту на газ, але канкрэтных лічбаў назваць не можа. «Складана прагназаваць гэты паказчык. Мы заклалі ў праекце бюджэту на 2011 год досыць высокі яго рост, але калі будзе неабходна, то зможам пераразмеркаваць асігнаванні на тыя або іншыя затраты», — патлумачыў кіраўнік Мінфіну дэпутатам. Паводле яго слоў, перамовы з Расіяй аб коштах на энерганосьбіты цяпер знаходзяцца на пачатковай стадыі, то бок інфармацыйнай. І ўдзельнікі перамоў нават не сфармулявалі свае пазіцыі.

Ці то з-за газавай невядомасці, ці з прычыны агульных эканамічных праблем, урад Беларусі падрыхтаваўся да прыцягнення знешніх пазыкаў і ў наступным годзе. Плануецца, што знешнія пазыкі краіны ў 2011-м складуць 2,2 млрд. долараў. Гэтыя сродкі будуць накіраваны на мадэрнізацыю эканомікі і забеспячэнне эканамічнай бяспекі краіны па ўзроўні золатавалютных рэзерваў, мадэрнізацыі энергетычнай сістэмы краіны, адзначыў Андрэй Харкавец. Па яго словах, на стварэнне новых вытворчасцяў будзе выдаткавана каля 913 млн. долараў. У прыватнасці, рэсурсаў чакаюць праекты будаўніцтва завода сульфатнай беленай цэлюлозы на базе Светлагорскага цэлюлозна-кардоннага камбіната, будаўніцтва завода індустрыяльнага домабудавання, а таксама запуск лініі па вытворчасці кальцыяванай соды ў Мазырскім раёне ды іншыя праекты.

**3 прычыны агульных эканамічных, праблем урад Беларусі падрыхтаваўся да прыцягнення знешніх пазыкаў і ў наступным годзе. Плануецца, што знешнія пазыкі краіны ў 2011-м складуць 2,2 млрд. долараў**

Міністр фінансаў Андрэй Харкавец паведаміў, што сярэдняя працэнтная стаўка знешняй пазыкі краіны складае 3,74% гадавых, сярэдні тэрмін пагашэння пазыкі — 6,3 гады. У агульным аб'ёме знешніх пазыкаў незвязаныя крэдытныя рэсурсы складаюць 85,4%, а звязаныя — 14,6%. Большую частку пазыкаў складаюць крэдыты Міжнароднага валютнага фонду (40,7%) і Расіі (38,4%).

Нацыянальны банк Беларусі агучвае інфармацыю, што валавы знешні доўг краіны за першы квартал бягучага года склаў 22,2 млрд. долараў. Гэтая сума складае 44,7% ад валавога ўнутрана прадукту. «Стратэгія кіравання дзяржпазыкай на сярэднетэрміновы перыяд заключаецца ў тым, каб забяспечыць патрэбы дзяржавы ў рэсурсах для ўстойлівага эканамічнага росту. Аб'ём дзярждоўгу захоўваецца на эканамічна бяспечным узроўні», — мяркуе Андрэй Харкавец.

## З аднай кішэні ў другую

Бюджэт запланаваны з дэфіцытам, падрыхтаваліся пазычаць грошы і адначасова ў праекце бюджэту — значны рост сацыяльнага пакету за кошт павышэння заработнай платы, пенсій, стыпендый. Міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна Шчоткіна супакойвае, што праблем з рэсурсамі няма. Маўляў, у бюджэце дзяржаўнага пазабюджэтнага Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны на 2011 год дастаткова сродкаў, каб не мець запазычанасцяў па сацыяльных выплатах. Даходы фонду вызначаныя ў памеры 20,7 трлн. рублёў, выдаткі — каля 20,5 трлн. рублёў. Фарміруецца фонд у асноўным з абавязковых выплат на сацыяльнае страхаванне. Больш за 80% выдаткаў будзе накіравана на пенсійнае забеспячэнне, плануецца павялічыць сумы на выплаты дапамогі ў сувязі з нараджэннем дзіцяці, па догляду за дзецьмі да трох гадоў, у сувязі з пастаноўкай на ўлік да 12 тыдняў цяжарнасці.

Аптымістычна выглядаюць і такія планавыя паказчыкі, як гадавая інфляцыя, тэмпы росту ВУП — 8% і 110% адпаведна. Сярэдні курс долара ў 2011 годзе мусіць быць на ўзроўні 3170 рублёў. Да слова, курс долара ўжо цяпер перавышае 3000 рублёў, і многія эканамісты лічаць яго адмыслова заніжаным, то бок атрымліваецца, што ўрад будзе працягваць утрымліваць эканоміку краіны на падушцы бяспекі датацый.

## Надзея на пошліны і падаткі

Асноўнымі крыніцамі падатковых даходаў кансалідаванага бюджэту будуць: падатак на дабаўленую вартасць — 35,1%, падаткі ад знешнеэканамічнай дзейнасці — 13,3%, падаткі на даходы і прыбытак — 12,8%, падаходны падатак — 10,1%, акцызы — 9,8%. Плануецца, што вырастуць даходы бюджэту ад увазных мытных пошлінаў, бо пасля ўступлення Беларусі ў Мытны саюз увазныя мытныя пошліны залежаць ад імпарту Беларусі, Расіі і Казахстана, залічваюцца «валам», а пасля размяркоўваюцца па бюджэтах членаў Мытнага саюза. Доля Беларусі складае 4,7%.

Яшчэ адзін з метадаў прыцягнення сродкаў у бюджэт — выпуск еўраабліггацый, што ўрад дзяржавы плануе актыўна выкарыстоўваць. У наступным годзе мяркуецца выпусціць еўраабліггацый на суму 1 млрд. долараў. Грошы будуць накіроўвацца на павялічэнне золатавалютных рэзерваў і выраўніванне сальда плацёжнага балансу. Як раней паведамляў Харкавец, плануецца, што Беларусь паспрабуе выйсці з еўраабліггацыямі на расійскі рынак.

Прадстаўляючы праект бюджэту на 2011 год, міністр фінансаў таксама расказаў, якую структуру запланавалі ўнутранаму дзяржаўнаму доўгу. Агульная яго сума будзе 4,6 трлн. рублёў, з іх унутраны доўг рэспубліканскага бюджэту складзе 1,7 трлн. рублёў, а мясцовых бюджэтаў — 2,9 трлн. Харкавец зазначыў, што праект закона забяспечвае бюджэтную ўстойлівасць у 2011 годзе, «але, калі ён фарміраваўся, то выявілася тэндэнцыя, якая ў сярэднетэрміновай перспектыве можа паўплываць на бюджэт негатыўна». Маюцца на ўвазе высокія тэмпы росту асобных выдаткаў у параўнанні з прыбыткамі. Часова гэта можна выправіць, калі павялічыць дэфіцыт бюджэту (што і было зроблена), «але сама наяўнасць такой тэндэнцыі патрабуе актыўнай працы па структурных пераўтварэннях у бюджэтным сектары. Мы прапануем рэалізаваць гэта за кошт пастаяннай эфектыўнасці дзяржвыдаткаў і праграм, уносячы пры неабходнасці змены ў такія праграмы. Бюджэтная сістэма не павінна знаходзіцца ў статычным стане», — зазначыў міністр фінансаў.

Мяркуецца, што на наступным тыдні парламент зацвердзіць у другім чытанні закон аб бюджэце на 2011 год і спадарожныя змены ў Падатковы і бюджэтны кодэксы, а таксама ў закон аб бюджэце фонду сацыяльнай абароны. Другая пазачарговая сесія прызначаная на 14 верасня.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# АПАНТАНЫЯ РЭЙТЫНГАМ

**Палата прадстаўнікоў разгледзела праект закона «Аб унясенні зменаў і дапаўненняў у Падатковы кодэкс». У Мінфіне гавораць пра «радыкальнае спрашчэнне падатковай сістэмы».**

Законапраект прадугледжвае адмену мясцовага падатку на паслугі і мясцовага збору на развіццё тэрыторыяў, трох плацяжоў у складзе экалагічнага падатку, а таксама павелічэнне інвестыцыйных ільготаў, паляпшэнне падатковага адміністравання. Згодна з праектам, са складу падатковай сістэмы выключаюцца збор пры ўвозе на тэрыторыю Беларусі азонаразбуральных рэчываў і збор за выдачу дазволаў на праезд аўтамабільных транспартных сродкаў Беларусі па тэрыторыі замежных дзяржаў, якія ўключаюцца, адпаведна, у склад экалагічнага падатку і ў склад дзяржаўнай пошліны. Усяго ў выпадку прыняцця законапраекту плануецца адмяніць пяць абавязковых плацяжоў.

Зніжэнне падатковай нагрузкі запланавана ў аб'ёме больш за 700 мільярдаў рублёў. Раней віцэ-прэм'ер Беларусі Андрэй Кабякоў на пасяджэнні прэзідыума Рады міністраў канстатаваў: нягледзячы на тое, што за апошні час у Беларусі быў скасаваны шэраг падаткаў, гэта не прывяло да істотнага паніжэння падатковай нагрузкі. У апошняй справаздачы Сусветнага банка Doing Business Беларусь па паказчыку «падаткаабкладанне» заняла апошняе, 183-е, месца.

Урад Беларусі зацыкліўся на тым, каб Беларусь увайшла ў трыццатку краін з найбольш спрыяльнымі ўмовамі для вядзення бізнесу — нават праводзяцца адмысловыя нарады з гэтай нагоды. Таму віцэ-прэм'ер мяркуе, што надрэнным будзе дасягненне Беларуссю 70-га месцы ў рэйтынгу па падаткаабкладанні.

Апроч падаткаў ёсць у эканоміцы і іншыя слабыя месцы. Па ўмовах вядзення міжнароднага гандлю Беларусь знаходзіцца на 129-м месцы, а па крэдытаванню — на 113-м.

ГАСПАДАРКА



# НЕБА Ў СМУЗЕ

Канстанцін СКУРАТОВІЧ

**Днямі Белстат паведаміў аб зменах метадаў статыстычнага ўліку сельскагаспадарчай прадукцыю, якую насельніцтва вырабляе на сваіх сотках і агародах. Як нам падаецца, гэты крок не выклікаў у грамадства той увагі, якую ён, безумоўна, заслугоўвае.**

Пасля масавай калектывізацыі, пра што ніколі не пісалі савецкія газеты, да пачатку 1980-х гадоў прыватныя падсобныя гаспадаркі калгаснікаў, рабочых і служачых выраблялі большую частку мясамалочнай прадукцыі ў СССР. Але і пасля без прыватных гаспадарак усё роўна немагчыма было абысціся, што знайшло адлюстраванне ў Харчовай праграме, якая была прынятая ў 1982 годзе. Перабудова надала «прыватнікам» яшчэ большыя стымулы, у выніку чаго пры захаванні буйных памераў жывёлагадоўлі, прыватны сектар стаў абсалютна дамінаваць у вытворчасці садавіны ды гароднiны. Напачатку 1990-х гадоў, калі была цалкам адрынута практыка так званай шэфскай дапамогі калгасам і саўгасам, яны амаль адмовіліся ад вытворчасці бульбы.

Згодна з афіцыйнымі дадзенымі, у 1993 годзе вытворчасць бульбы ў гаспадарках насельніцтва склала 74% ад агульнага аб'ему, гародніны — 73%, садавіны — больш за 90%. Вытворчасць мяса ў прыватнікаў склала 1/6 частку агульнага аб'ему, малака — 35%, яек — 40%. У Беларусі тады яшчэ існавала авечкагадоўля, у большасці прыватная, дзе было атрымана 57% воўны.

Вельмі сур'ёзныя лічбы, ад якіх ніхто не мог адмахнуцца. Нават тыя, хто лічыў, што прыватнік краіну не накорміць, былі змушаныя ствараць умовы для існавання падсобных і развіцця фермерскіх гаспадарак. Але пасля 1994 года сітуацыя пачала імкліва мяняцца. Уладу ў Беларусі атрымалі «дзейсныя аграрыі», якія ўсе магчымыя рэсурсы накіравалі ў грамадскі сектар, а ў краіне пачалася імклівая дэпапуляцыя, якая заявіла пра сябе праз катастрафічнае выміранне вясковага насельніцтва.

Гэту відавочную дэградацыю было абяцана кампенсаваць хуткімі зменамі, якімі зможа карыстацца ўсё грамадства. Не, малочных рэк у кісельных берагах не абяцалі, але вытворчасць сельгаспрадукцыі ў хуткім часе павінна была дасягнуць паказчыкаў 1990 года, калі, на думку вышэйшага кіраўніцтва, Беларусь добра кармілася сама і карміла палову Савецкага Саюза.

Нічога дзіўнага, што ў хуткім часе ў большасці вёсак паменела ці зусім не засталося кароў, свіней, птушкі. Зусім не выключэннем былі такія гаспадаркі, дзе трымалі больш сабак, чым хатняй птушкі.

Тым не менш, да гэтага часу афіцыйна лічыцца, што ў асабістых падсобных гаспадарках вытворчасць складае больш за 30% ад агульнага памеру. Па дадзеных Белстата, зараз налічваецца больш за 1 мільён прыватных падсобных гаспадарак грамадзян, што стала пражываюць у вёсках. Як ні лічы, але атрымліваецца, што колькасць занятых «падсобным земляробствам» значна перавышае мільён чалавек. І гэта пры тым, што афіцыйна ў галіне занята каля 430 тысяч чалавек.

Карацей, павінны ж вяскоўцы нешта вырабляць. Па тлумачэнні Белстата, прыватныя падсобныя гаспадаркі — гэта адна з груп вытворцаў сельгаспрадукцыі, назіранне за якой ажыццяўляецца на аснове дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці. Гэта справаздачнасць прадстаўляецца ў органы дзяржстатыстыкі сельскімі (пасялковымі) выканаўчымі камітэтамі на аснове дадзеных гаспадарчых кніг.

Зараз, як паведамляе БЕЛТА, у Белстаце вырашылі, што ўлік аб'ёмаў вытворчасці па дадзеных гаспадарчых кніг «затратэн» і «праблематычэн». Наколькі «затратэн», гэта патрабуе спецыяльных разлікаў, але калі разумець пад «праблематычнасцю» немагчымасць атрымаць дастаткова дакладныя дадзеныя, то з гэтым можна цалкам пагадзіцца. Справа ў тым, што раней за калгасамі, за хатняй гаспадаркай вяскоўцаў пільна назіралі розныя ўпаўнаважаныя ды інспектары. Інакш, зрэшты, і нельга было, бо кожная жывёліна (а пры Сталіне — і кожнае пладовае дрэва, і ледзь не кожны куст) лічылася аб'ектам падаткаабкладання. А пры Хрушчове выяўлялі «лішніх» парасят ды цялят, каб калгаснік не распанеў на сваім сале ды малацэ ды не страціў ахвоты да арцельнай працы. У былыя часы пільна сачылі, каб калгаснік не завёў сабе каня, бо гэта быў сродак вытворчасці, якім ён не мог валодаць ні пры якіх умовах.

А зараз што? Сельскі савет, у якога шмат розных функцый, але няма грошай і спецыялістаў, не мае магчымасці весці такі вось падрабязны ўлік. Таму і запісы ў гаспадарчых кнігах абнаўляюцца толькі тады, калі вяскоўцу трэба вырашаць нейкія пільныя справы. Часцей за ўсё, гэта адбываецца пры афармленні дакументаў на спадчыну. Вось тады адкрываюцца кнігі і ўдакладняюцца звесткі. Могуць запытаць, калі вы збылі сваю карову. І часта бывае так, што карову ўжо 10 гадоў як здалі на мяса, а па запісах яна ўсё яшчэ доіцца і дае малако.

Былі ў Гогаля «мёртвыя душы», з дапамогай якіх Чычыкаў спрабаваў нажыць сабе «жывы капітал», а зараз «мёртвыя» каровы, свінні ды бульбяныя палеткі, якія на самай справе рэгулярна даюць статыстычныя паказнікі вытворчасці.

Селяніну ўсё гэта абсалютна, як кажуць, фіялетава, сельсавету патрэбна для адпіскі, а дзяржаве — для дакументальнай аргументацыі статыстычных вытворчых дасягненняў. Праўда, час ад часу яна пачынае пляскаць сябе па пустых кішэнях і пакрыўджана ўсклікаць — дзе, куды дзеўся статыстычны прадукт.

Як гэта здарылася ў гэтым годзе з бульбай, якую памкнуліся прадаваць на экспарт (яна па статыстыцы на 80% выраблялецца ў гаспадарках насельніцтва), — а яе няма. Вось і прадаваць няма чаго.

Зараз жа Белстат мае намер вызначаць аб'ёмы вытворчасці ў прыватных гаспадарках на аснове выбарачнага апытання незалежнымі спецыялістамі, як тое робіцца ў іншых краінах. З гэтай мэтай і пачалася праца па ўкараненні ў 2011 годзе на сістэматычнай аснове выбарачнага абследавання вытворчасці сельгаспрадукцыі ў асабістых падсобных гаспадарках.

Вось і думайце, якімі статыстычнымі вынікамі пацешыць краіну прыватны аграсектар у наступным годзе. На наш погляд, меншымі яны не будуць.

Як у адным з анекдотаў пра сутнасць тэорыі рэлятыўнасці пытаюцца: адносна чаго? У вялікай афіцыйнай статыстыцы, якая разлічваецца на аснове бухгалтарскага (строгага, наколькі недакладнасці тут караюцца турэмнымі тэрмінамі) уліку, на гэта пытанне даецца ўсім вядомы адказ — адносна 1990 года.

І ўсе быццам бы ведаюць, што ў сельскай гаспадарцы гэты ўзровень ужо даўно і значна перасягнуты. І што параўноўваць цяперашнія аб'ёмы з ранейшымі — як параўноўваць вытворчасць танкаў у СССР і царскай Расіі. Неба і зямля! Аднак гэта неба пры вельмі нізкай воблачнасці, а часам у такой смузе, што і не адрозніш, дзе заканчваецца зямля і пачынаецца неба.

У БССР больш за ўсё мяса (1 786 тыс. тон у жывой вазе) было выраблена ў 1989 годзе. У 2009-м — 1 330 тыс. тон, ці 75,6%.

Не хацелася б, але даводзіцца прызнаць, што класічны калгасны лад быў эканамічна больш эфектыўным, чым цяперашні, рэфармаваны. Валавыя паказчыкі, што відавочна, былі вышэйшымі, а рэсурсаёмістасць (гэта робіцца відавочным пры параўнанні аб'ёмаў капіталаўкладанняў) — ніжэйшай.

Цяперашнім гаспадаркам не дапамагаюць нават сучасныя заходнія тэхналогіі, імпартныя машыны, механізмы і абсталяванне, магчымасці якіх яны не могуць выкарыстоўваць напоўніцу.

Гэта сітуацыя лішні раз доказвае неадназова пацверджанае досведам іншых краін — ніякія, нават самыя сучасныя тэхналогіі не здольныя кампенсаваць эканамічныя страты адмовы ад сацыяльнага і эканамічнага рэфармавання так званых «калектыўных гаспадарак». А ў адсутнасць рэформаў не знаходзіць стымулаў для развіцця і прыватнае земляробства.

# ПАКАЗЧЫКІ ЛЕПШЫЯ ЗА ВЫНІКІ

**Па дадзеных афіцыйнай статыстыкі, сельская гаспадарка Беларусі была ў 2009 годзе адной з паспяховых галін эканомікі. Яна не выканала прагнозных паказчыкаў па тэмпах павялічэння вытворчасці, але ўсё ж падвысіла памеры на 1,3%.**



Праўда, нават гэты нязначны рост быў атрыманы коштам значнага пагаршэння фінансавых вынікаў дзейнасці сельгасарганізацый. Сума пратэрмінаваных крэдытных абавязацельстваў за год павысілася на 36,6%.

Для выпраўлення сітуацыі (а лепш сказаць, канчатковага фінансавага крушэння сельгасарганізацый) спецыяльным указам прэзідэнта ім прадстаўлена 10-гадовая адтэрміноўка запазычанасці па стану на 1 студзеня 2010 года.

**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял. Заключная серыя.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Сакрэтныя гісторыі».
**14.40** «Студэнты 2». Серыял.
**15.35** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі» Серыял.
**16.50** СТБ прадстаўляе: «З чаго пачынаецца Радзіма».
**17.20** «Мінշчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** Фільм «Паміж анёлам і нячысцікам». Францыя, 1995 г.
**22.55** «Гарачы лёд».
**23.25** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.05** Фільм «Па-за дасяжнасцю». ЗША-Польшча, 2004 г.
**01.35** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**06.35** Жаночая ліга.
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Час футболу.
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.35** Меладрама «Успамін» (Францыя).
**12.15** Гаспадар.
**12.40** Камедыйны серыял «Венера і Апалон» (Францыя). Заключная серыя.
**13.30** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**14.30** Мультсерыял «Дракончык і яго сябры» (Канада).
**15.10** Пазакласная гадзіна.
**15.25** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.20** Усё аб бяспецы.
**17.50** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**18.55** Хакей. КХЛ. Амур (Хабараўск)-Дынама (Мінск). У перапынку: Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**22.05** «Бітва экстрасэнсаў».
**23.15** «Пра мастацтва».
**23.40** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Агляд матчаў 1-га тура.
**00.35** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія.
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.25** «Кулагін і партнёры».
**11.55** Тэлесерыял «Дыхай са мной». 2010 г.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Прэм'ера. «Сапраўднае жыццё».
**16.05** Прэм'ера. «Формула кахання». Токшоў.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Багатая і каханая». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.25** Прэм'ера. «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія, 2010 г.
**20.25** Яўген Петрасян. 65 - юбілей ізноў!.
**22.20** Навіны - Беларусь.
**22.30** Яўген Петрасян. 65 - юбілей ізноў! Працяг.
**00.20** Камедыя «Сватанне гусара».

### НТВ

**05.55** Інфармацыйны канал «НТБ ранiцай».
**08.40** «Рускія сенсацыі».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «І зноў добры дзень!».
**11.15** «Лепшы горад Зямлі».
**12.05** Дэтэктыўны серыял «Угро».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак».
**15.10** «Асабліва небяспечны!».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Фантастычны баявік «Тэлепорт».
**21.20** Дэтэктыўны серыял «Глушэц. Працяг».
**22.20** Прэм'ера. «Незвычайны канцэрт».

### EUROSPORT

**09.35** Ралі-рэйд. «Шаўковы шлях». Этап 6.
**09.45** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Жанчыны. Трынідад і Табага. 1/4 фіналу.
**11.00** Маунцінбайк. Чэмпіянат свету. Маунт Плезант (Канада).
**12.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. Этап 18.
**13.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Жанчыны. Трынідад і Табага. 1/4 фіналу.
**14.30** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Жанчыны. Трынідад і Табага. 1/4 фіналу.
**16.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. Этап 18.
**17.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. Этап 19.
**18.45** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Жанчыны. Трынідад і Табага. 1/4 фіналу.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Жанчыны. 48 кг. Анталія (Турцыя).
**22.00** Боўлінг. Тур PBA. ЗША. Часопіс.
**23.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Жанчыны. Трынідад і Табага. 1/4 фіналу.
**01.00** Ралі-рэйд. «Шаўковы шлях». Этап 7.
**01.15** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. Этап 19.
**01.45** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**07.50** Сальда (эканамічная праграма).
**08.05** Без рэтушы: «Беларуская Амерыка», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**08.25** Форум (ток-шоў): «Купляем беларускае?»
**09.10** Басаножпа свеце (спазнаваўчая праграма): «Паляванне з бушменамі».
**09.35** Беларусы ў Польшчы.
**09.50** «100 хвілін вакацыяў», тэлесерыял: 2 серыя.
**10.15** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: ч. 2, 11 серыя.
**11.05** «Фальшываманетнікі. Вяртанне «Згаі», серыял: 6 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Чароўнае дрэва», серыял: 2 серыя.
**17.30** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: ч. 2, 11 серыя.
**18.15** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Парад пераможцаў», дак. фільм, 2007 г., Польшча.
**19.10** Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў: «Малыя і сярэднія фірмы Еўразвязу».
**19.25** Калыханка для самых маленькіх.
**19.35** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.05** «Чаму дэмакратыя?», цыкл рэпартажаў: 2 серыя: «У пошуках рэвалюцыі».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Госць «Белсату».
**21.45** «Генерал Клеэбэрг і ягоныя жаўнеры», рэпартаж, 2007 г., Польшча.
**22.35** «Гэтыя і тыя», маст. фільм, 1981 г., Францыя. 2 серыя.
**00.05** Аб'ектыў.

## 18 ВЕРАСНЯ, СУБОТА

### 1

**06.50** Дакументальна-пазнавальны серыял «Асабнякі, дзе вяршылася гісторыя» (Францыя).
**07.20** Існасць.
**07.45** Дзень спорту.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.05** Здароўе.
**09.35** Пазнавальны серыял «Чалавек супраць дзікай прыроды» (ЗША-Вялікабрытанія).
**10.30** Дак. цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**11.25** Дакументальны цыкл «Невядомая версія. Мужыкі» (Украіна).
**12.10** Меладрама «Мужыкі» (СССР).
**14.05** Прэм'ера. Дакументальны фільм «Завядзёнка» (Беларускае тэлебачанне).
**14.35** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Вакол планеты.
**16.15** Дакументальна-гістарычны цыкл «У пошуках ісціны» (Украіна).
**17.10** Відэафільм АТН «Прабач мяне».
**17.40** Відэафільм АТН «Магілёўскія відарыcы» цыклу «Зямля беларуская».
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Канцэрт Ф.Кіркорава.
**21.00** Панарама.
**21.40** Фільм тыдня. Меладрама «Жыццё, або Нешта ў гэтым родзе» (ЗША).
**23.25** Трылер «Ганібал. Узыходжанне» (Францыя-Вялікабрытанія-Італія-Чэхія).

### АНТ

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** «Леў Дураў. Я заўсёды напяваю, калі хочацца выць».
**12.10** Тэлечасопіс «Звяз».
**12.40** Фільм «Мой ласкавы і пяшчотны звер».
**15.00** Прэм'ера АНТ. «Брэйн-рынг».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Тур дэ Франс».
**17.15** «Хвіліна славы».
**18.55** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**19.55** АНТ прадстаўляе: «Чакай мяне». Беларусь.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Дэтэктар хлусні».
**22.10** Прэм'ера. «Пражэктарпэрысхілтан».
**22.50** Меладрама «Ваніль і шакалад».
**00.40-02.25** Фільм «Забароненае царства».

### СТВ

**07.15** «Анфас».
**07.30** Фільм «Выспа скарбаў». СССР, 1982 г. 1 і 2 серыі.
**09.40** «Дабро пажаліцца».
**10.00** «Крокі да поспеху».
**10.55** «Мінск і мінчане».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Новыя падарожжы дылетанта».
**13.50** «Дарагая перадача».
**14.00** Фільм «Прыгонная акторка». СССР, 1963 г.
**15.45** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.45** Фільм «Прывітанне, кіндэр!». Расія, 2008 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.30** Фільм «Малая на мільён». ЗША, 2004 г.
**23.55** Фільм «1001 рэцэпт закаханага кулінара». Германія - Расія - Францыя, 1996 г.
**01.40** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**06.45** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**07.15** Усё аб бяспецы.
**07.40** Нашы тэсты.
**08.45** Жаночая ліга.
**09.15** «Рэальны свет».
**09.50** Жансавет.
**10.35** «Ты-тое, што ты ясі». Аздараўленчая праграма (Расія). Заключная серыя.
**11.15** Тэлебарометр.
**11.20** «Запал па культуры».
**12.00** Кінараман «Старшыня» (СССР). 1-я і 2-я, заключная, серыі.
**15.00** Камедыйны серыял «Дурнушка Бэці2» (ЗША).
**16.05** Лірычная камедыя «Самотнае неба» (Расія). 1-я-4-я, заключная, серыі.
**19.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Сандэрленд-Арсенал. Прамая трансляцыя.
**21.25** Тэлебарометр.
**21.30** Джэймс Бонд-Агент 007. Баявік (Вялікабрытанія).
**23.30** Жывы гук.
**00.15** Гандбол. Мужчыны.Таварыскі матч. Беларусь-Румынія.

### РОССИЯ

**07.00** «Уся Расія».
**07.15** Яўген Петрасян. 65 - юбілей ізноў!.
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** Камедыя «Сватанне гусара».
**13.30** «Нататкі натураліста».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Мая планета».
**14.45** «Пакой смеху».
**15.35** Дэтэктыў «Па дадзеных крыміна元нага вышуку».
**17.00** «Суботні вечар».
**19.00** Весткі ў суботу.
**19.40** «Гарадок». Дайджэст.
**20.15** Прэм'ера. Фільм «Белы наліў». 2010 г.
**23.35** Фільм «Кар'ера Дзімы Горына».
**01.15** Прэм'ера. «33 вясёлыя літары».

### НТВ

**07.35** «Агляд».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Авіятары».
**08.50** «Выратавальнікі».
**09.25** «Жывуць жа людзі!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.50** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Жаночы погляд».
**14.15** Прыгодніцкая камедыя «Мамант».
**16.00** Сёння.
**16.25** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Злачынства будзе раскрыта».
**17.25** «Вочная стаўка».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум».
**21.10** «Рускія сенсацыі».
**22.15** «Ты не паверыш!».
**23.15** Фільм «Шпількі».

### EUROSPORT

**09.30** Ралі-рэйд. «Шаўковы шлях». Этап 7.
**09.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Часопіс.
**10.15** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Жанчыны. Трынідад і Табага. 1/4 фіналу.
**11.15** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. Этап 19.
**12.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Жанчыны. Трынідад і Табага. 1/4 фіналу.
**13.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Жанчыны. Трынідад і Табага. 1/4 фіналу.
**14.00** Аўтаспорт. Формула-2. Валенсія (Іспанія). Гонка 1.
**15.00** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно. Сільверстоун (Вялікабрытанія). Гонка 1.
**16.00** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Кваліфікацыя. Валенсія (Іспанія).
**16.45** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. Этап 20.
**18.45** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны. 56 кг. Анталія (Турцыя).
**20.00** Снукер. Адкрыты Чэмпіянат свету. Глазга (Вялікабрытанія). Дзень 1.
**21.00** Снукер. Адкрыты Чэмпіянат свету. Глазга (Вялікабрытанія). Дзень 1.
**00.00** Ралі-рэйд. «Шаўковы шлях». Этап 8.
**00.15** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**02.00** Снукер. Адкрыты Чэмпіянат свету. Глазга (Вялікабрытанія). Дзень 1.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** На колах.
**07.50** Госць «Белсату».
**08.05** «Генерал Клеэбэрг і ягоныя жаўнеры», рэпартаж, 2007 г., Польшча.
**09.00** Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў: «Малыя і сярэднія фірмы Еўразвязу».
**09.15** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Парад пераможцаў», дак. фільм, 2007 г., Польшча.
**10.05** «Чароўнае дрэва», серыял: 2 серыя.
**10.30** Калыханка для самых маленькіх.
**11.10** «Чаму дэмакратыя?», цыкл рэпартажаў: 2 серыя: «У пошуках рэвалюцыі».
**12.15** «Гэтыя і тыя», маст. фільм, 1981 г., Францыя. 2серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.05** Чалавек і вайна: «Яны хацелі забіць Гітлера», дак. фільм, 2004 г., Германія. 4 серыя: «Апошні шанец».
**18.55** Тыдзень з радыё «Свабода».
**19.30** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Еўропа сёння.
**20.15** Вагон.
**20.30** Басаножпа свеце (спазнаваўчая праграма): «На ўскрайку Сахары».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Суботні сеанс: «Вакол свету за восемдзесят дзён», маст. фільм, 2004 г., ЗША.
**23.15** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Жыццёвае пытанне».
**23.25** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 19 ВЕРАСНЯ, НЯДЗЕЛЯ

### 1

**08.10** Мультфільмы.
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.05** «Арсенал».
**09.35** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.50** Альманах вандраванняў.
**10.15** Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
**10.50** «OFF STAGE LIFE».
**11.05** Дакументальны цыкл «Невядомая версія.
**12.10** Камедыя «Неверагодныя прыгоды італьянцаў у Расіі» (СССР).
**14.05** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Еўрабачанне-2010». Дзённік Міжнароднага дзіцячага конкурсу песні.
**15.55** Прэм’ера. Сямейны фантастычны мультфільм «Планета № 51» (ЗША-Вялікабрытанія-Іспанія).
**17.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**18.05** Суперлато.
**19.15** «OFF STAGE LIFE».
**19.30** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**20.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.55** «КЕНО».
**21.00** «У цэнтры ўвагі».
**22.05** Вострасюжэтны дэтэктыўны серыял «Ліквідацыя» (Расія). Заключныя серыі.

### Н

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.10** «Фазэнда».
**11.50** «Ранішняя пошта».
**12.25** Камедыя «Лысы нянька: Спецзаданне».
**14.05** «Мой радавод».
**15.00** Прэм’ера АНТ. «Брэйн-рынг».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Асяроддзе пасялення.
**17.40** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**18.55** АНТ прадстаўляе: «Давай ажэнімся!».
**20.00** Контуры.
**21.05** Прэм’ера сезону. «Лёд і агмень».
**00.05** «Паўднёвае Бутава».

### СТВ

**06.55** «Вовачка - 2». Камедыйны серыял.
**07.50** Фільм «Паміж анёлам і нячысцікам». Францыя, 1995г.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Добры дзень, доктар!».
**13.50** «Дарагая перадача».
**14.10** Фільм «Вуліца поўная нечаканасцяў». СССР, 1957г.
**15.35** «Ваенная таямніца».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.55** Чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па футболе: «Шахцёр» (Салігорск) - «Дынама» (Мінск). Прамая трансляцыя.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Няверная». Германія - ЗША - Францыя, 2002г.
**22.55** «Прафесійны бокс».
**23.55** Фільм «Юр’еў дзень». Расія, 2008г.
**02.15** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**07.10** Дабравест.
**07.35** Мір вашай хаце.
**07.45** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**08.20** Нашы тэсты.
**09.30** Жаночая ліга.
**10.00** Медычныя таямніцы.
**10.40** Школа рамонту.
**11.55** Тэлебарометр.
**12.00** «Правы чалавека».
**12.10** Джэймс Бонд-Агент 007. Баявік (Вялікабрытанія).
**14.20** Камедыйны серыял «Дурнушка Бэці-2» (ЗША).
**15.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм’ерліга. Манчэстэр Юнайтэд-Ліверпуль. Прамая трансляцыя.
**17.25** Дакументальны цыкл «Неверагодныя гісторыі кахання» (Украіна).
**18.20** Дэтэктыўная меладрама «Халоднае сонца» (Расія).
**20.30** Тэлебарометр.
**20.50** Смешная часіна.
**21.25** Джэймс Бонд-Агент 007. Баявік (Вялікабрытанія).
**23.30** Культасвет.
**00.00** Гандбол. Мужчыны.Таварыскі матч. Беларусь-Румынія.

### РОССИЯ

**07.00** «Звычайны канцэрт».
**07.30** Фільм «Белы наліў». 2010 г.
**11.00** Весткі.
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** Фільм «Калі мне будзе 54 гады».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.45** «Закаханы Петрасян». Дакументальны фільм.
**15.40** Фільм «На вайне як на вайне».
**17.25** Прэм’ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**19.00** Весткі тыдня.
**20.00** «Сумленны дэтэктыў».
**20.35** Фільм «Моцная слабая жанчына». 2010 г.
**22.30** «Адмысловы карэспандэнт».
**23.40** Фільм «Пацалунак матыля». 2006 г.

### НТВ

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Першая перадача». Аўтамабільная праграма.
**10.55** Прэм’ера. «Цячэ Волга» з дакументальнага цыклу «Праспявана ў СССР».
**11.50** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.30** «Лепшы горад Зямлі».
**14.20** «Суд прысяжных: Галоўная справа».
**16.00** Сёння.
**16.25** Прэм’ера. Дэтэктыўны серыял «Злачынства будзе раскрыта».
**17.25** «І зноў добры дзень!».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** Сёння. Выніковая праграма.
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.50** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**22.05** Прэм’ера. Дэтэктыўны серыял «Дарожны патруль».
**23.55** «Асабліва небяспечны!».
**00.30** «Футбольная ноч».
**01.00** Прэм’ера. «Нерэальная палітыка».

### EUROSPORT

**09.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Warm-Up. Валенсія (Іспанія).
**10.00** Настольны тэніс. Чэмпіянат Еўропы. Вострава (Чэхія). 1/4 фіналу.
**11.00** Настольны тэніс. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Вострава (Чэхія). 1/2 фіналу.
**12.45** Аўтаспорт. Картынг. Чэмпіянат свету. Суэра (Іспанія).
**13.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Валенсія (Іспанія).
**14.45** Аўтаспорт. Формула-2. Валенсія (Іспанія). Гонка 2.
**15.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Валенсія (Іспанія).
**17.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. Этап 21.
**18.45** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны. 62 кг. Анталія (Турцыя).
**20.00** Настольны тэніс. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны/жанчыны. Вострава (Чэхія). Фінал.
**21.00** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно. Сільверстоун (Вялікабрытанія). Гонка 2.
**21.30** Мотаспартыўны часопіс.
**21.45** Снукер. Адкрыты Чэмпіянат свету. Глазга (Вялікабрытанія). Дзень 2.
**00.00** Бокс. Міжнародны турнір Super Six World Boxing Classic. ЗША.
**01.15** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. Этап 21.
**02.15** Мотаспартыўны часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб’ектыў.
**07.10** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**07.35** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма).
**08.05** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**08.15** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма): «На ўскрайку Сахары».
**08.45** Чалавек і вайна: «Яны хацелі забіць Гітлера», дак. фільм, 2004 г., Германія. 4 серыя: «Апошні шанец».
**09.30** Калыханка для самых маленькіх.
**10.00** «Арол: крымінальная сага», серыял: 2 серыя.
**10.55** «Вакол свету за восемдзесят дзён», маст. фільм, 2004 г., ЗША.
**17.05** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.20** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**17.50** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 12 серыя.
**18.30** Дакументальная гадзіна: «Дамова з Гітлерам», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**19.30** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Бітва на рацэ Ула».
**19.50** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.05** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**20.30** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма): «Вярблюд».
**21.00** Тыдзень у «Аб’ектыве».
**21.30** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**21.55** Фільматэка майстроў: «Ціша пасля стрэлу», драма, 2000 г., Германія–Францыя.
**23.35** Тыдзень у «Аб’ектыве».

# Шаноўныя чытачы!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску. Падпісацца можна на любую кольскасць месяцаў праз пошту або праз банк. Нашы рэквізіты: нумар рахунку: 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і пропісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐ № ______ (вход, по карте отправки)

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ______
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ______

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Ідзем у адзяленне банка і на адмысловым бланку пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
2. Указваем суму аплаты і здзяйсняем пералік грошай.
3. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
4. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя: 3012741108019 Лицевой счет: Код 739
УНП*: 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Пеня ______
Всего ______

Кассир

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

Новы час

www.novychas.org

ІДЭАЛОГІЯ

# РАЎШАН І ДЖАМШУТ — АРЫЙЦЫ

Іван БІЧ

**Тэзіс пра тое, што таджыкі паходзяць ад старажытных арыяў, у цяперашнім Таджыкістане ператварыўся ў частку афіцыйнай ідэалогіі. На чарзе стварэнне інтэрнацыяналу арыйскіх нацый.**




У Таджыкістане знайшлі сапраўдных арыйцаў

У Савецкім саюзе арыйскі міф як дзяржаўная дактрына гітлераўскай Германіі быў пад суровай забаронай. Нават за захаванне ў кніжнай шафе твораў Альфрэда Розенберга — вядучага тэарэтыка Трэцяга Рэйху, які сцвярджаў, што кіруючая роля ў свеце мусіла належаць арыйскай (нямецкай) расе, — пагражала турма. Аднак цяпер высвятляецца, што тая забарона дзейнічала не паўсюдна — яшчэ ў 1950-я гады Кампартыя Таджыкістана неафіцыйна замовіла гісторыкам канцэпцыю пра тое, што таджыкі — нашчадкі арыяў.

Асацыяцыя з легендарнымі арыямі патрэбна была, каб у некаторай ступені кампенсаваць масавую нацыянальную траўму. Маюцца на ўвазе наступствы савецкага нацыянальна-адміністратыўнага размежавання ў Сярэдняй Азіі ў 1920–1930-я гады. У выніку рэформы ў створаную ў 1924 годзе Таджыкскую АССР (на той час частку Узбекскай ССР і будучую асобную савецкую рэспубліку) не ўвайшлі Самарканд, Бухара і іншыя эканамічна развітыя гарады і рэгіёны, дзе пражывала і дасюль пражывае шмат таджыкаў.

Дарэчы, нацыянальная палітыка бальшавікоў у Сярэдняй Азіі сапраўды была вельмі дзіўнай і супярэчлівай. Так, па выніках згаданага вышэй падзелу, невядома куды знік цэлы этнас — сарты. Адпаведна царскаму перапісу насельніцтва 1893 года, сарты існавалі, а па выніках савецкіх перапісаў іх ужо няма. З іншага боку, бальшавікі былі піянерамі ў сваёй справе. У 1920–1930-я гады выразнай нацыянальна-этнічнай самаідэнтыфікацыі ў тубыльскага насельніцтва яшчэ не было — большасць называла сябе галоўным чынам «мусульмане».

Так ці інакш, у 1950-я гады ўзнікла канцэпцыя арыйскага паходжання таджыкаў. Яе галоўны тэзіс: таджыкі — нашчадкі арыйцаў, яны з'яўляюцца «сапраўдным карэнным» насельніцтвам рэгіёна, у той час як цюркскія народы нібы пайшлі ад «прышлых» качэўнікаў.

З крахам «вялікага і магутнага» СССР арыйскай тэме далі зялёнае святло. Цяпер таджыкі сталі прамымі нашчадкамі насельніцтва Арыяны — арыйскай цывілізацыі, якая быццам існавала восем тысяч гадоў таму. Дарэчы, у гэтай галіне гісторыкі з Душанбе нават далі фору Туркменбашы, які таксама любіў шукаць карані туркменаў у глыбокай старажытнасці. Яго прыдворныя гісторыкі «даказалі», што туркменская дзяржава існавала 6 тысяч гадоў таму.

З'явілася і ідэя пра «гістарычны», ці «вялікі», Таджыкістан.

**У выніку таджыкскім чыноўнікам давялося прыдумаць тлумачэнне: свастыка — арыйскі знак сонца — ёсць правільная і няправільная**

Гэты «гістарычны Таджыкістан», па словах некаторых таджыкскіх аўтараў, існаваў, прынамсі, ужо 2500 гадоў таму і быў створаны персідскай дынастыяй Ахеменідаў. Ён нібыта ахопліваў усю тэрыторыю пражывання старажытных арыяў — Сярэднюю Азію і вялікую частку тэрыторый Ірана і Афганістана. Пры гэтым актыўна пачаў ужывацца тэрмін «маленькі сучасны Таджыкістан».

Хто б сумняваўся, што ў ролі галоўнага арыйца выступіць сам таджыкскі прэзідэнт Эмамалі Рахмон. 12 верасня 2003 года ён выдаў спецыяльны ўказ, паводле якога «ў мэтах вывучэння і прапаганды ўнёску арыйцаў у гісторыю сусветнай цывілізацыі, выхавання пакалення ў духу нацыянальнай самасвядомасці, дзеля развіцця сувязяў паміж народамі і культурамі» 2006 год абвяшчаўся «Годам арыйскай цывілізацыі». Тады былі арганізаваныя шматлікія ўрачыстыя мерапрыемствы, а вуліцы таджыкскіх гарадоў упрыгожылі плакатамі, якія праслаўлялі арыйскія карані таджыкаў.

На некаторых з тых плакатах была намалёвана свастыка. У выніку таджыкскім чыноўнікам давялося прыдумаць тлумачэнне: свастыка — арыйскі знак сонца — ёсць правільная і няправільная. У фашыстаў яна была няправільная, паколькі промні на ёй рухаюцца направа. А ў таджыкаў — правільная, таму што промні накіраваныя ў левы бок.

Відавочна, што культ арыяў вельмі трывожна ўспрынялі ў Ташкенце. Існуюць шмат памежных канфліктаў з Душанбэ. Акрамя таго, таджыкскае пытанне застаецца вельмі важным ва ўнутранай палітыцы Узбекістана. Таджыкі дасюль складаюць вялікую частку насельніцтва некаторых буйных гарадоў, што дае падставу таму ж Рахмону казаць (праўда, не на афіцыйным узроўні) пра неабходнасць рэвізіі вынікаў савецкага нацыянальнага-адміністратыўнага размежавання.

З узбекскага боку таксама распачаліся гістарычныя пошукі, закліканыя аспрэчыць «арыйскае першародства» таджыкаў. Набор аргументаў вельмі шырокі — ад адмаўлення тоеснасці таджыкаў і арыйцаў да сцвярджэнне, што цюркі ёсць галоўнымі аўтахтонамі Сярэдняй Азіі.

Узбекскія гісторыкі імкнуцца таксама звузіць арэал «традыцыйнага» пражывання таджыкаў, абмежаваўшы яго горнымі раёнамі Паміра. Нарэшце, у Ташкента ёсць уласная гістарычная міфалогія, што вядзе радавод цяперашняй узбекскай дзяржавы ад імперыі Цімура, якая таксама ў свой час уключала ў сябе практычна ўвесь Цэнтральна-Азіяцкі рэгіён.

Адначасова Таджыкістан спрабуе выкарыстаць арыйскую тэму ў якасці геапалітычнага козыра. Рахмон прапанаваў праект «персідскага дыялогу» — ініцыятыва альянсу Афганістана, Ірана і Таджыкістана як аб'яднання краін, блізкіх этнакультурна. Ідэя ўжо часткова рэалізаваная. У жніўні гэтага года ў Тэгеране адбыўся ўжо трэці саміт альянсу з удзелам прэзідэнтаў Таджыкістана, Афганістана і Ірана. Хаця, натуральна, да сапраўднага арыйскага інтэрнацыяналу вельмі далёка. Напрыклад, афганцы і таджыкі — суніты. А іранцы — шыіты.

Як лічаць эксперты, адзінае, што можа прынесці арыйскі альянс, — больш інтэнсіўны характар ірана-таджыкскіх адносін. Вынікам гэтага можа стаць пранікненне ў Таджыкістан радыкальных ісламскіх ідэяў з усімі наступствамі для рэжыму Рахмона.

Напрыканцы — кур'ёзны факт. Дыскусія пра арыйскія карані таджыкаў выклікала папросту шок сярод рускіх шавіністаў, для якіх усе выхадцы з Сярэдняй Азіі — людзі другога гатунку. А калі сыходзіць з расавай канцэпцыі Таджыкістана, славяне павінны разглядаць таджыкаў — прамых нашчадкаў арыяў — у якасці гаспадароў.




## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Гэта (фільмы «Хросны Бацька») усё ад бяссілля. Пуцін не можа разабрацца з Лукашэнкам, рэжым якога ён карміў доўгія гады. Што нядзіўна, паколькі беларускі «Бацька» выкарыстаў атрыманыя ад Расіі грошы на ўмацаванне ўласнай улады, рэпрэсіўнага апарату і знішчаў апазіцыю. Ён забяспечыў сабе абсалютную ўладу, і зараз яго скалупнуць немагчыма. Таму Пуцін і шалее.

**«Республика» (Казахстан)**

Інтэрнэт-сайт Бебеніна на працягу многіх гадоў быў платформай для дэмакратычнага руху ў Беларусі. Незалежным журналістам ужо даўно пагражае небяспека, хоць арганізацыя «Рэпарцёры без межаў» летась прыйшла да высновы, што сітуацыя ў гэтай галіне «трошкі палепшылася пасля таго, як стаў больш інтэнсіўным дыялог з Еўрасаюзам». Расія, паводле праведзенага гэтай арганізацыяй даследавання, упершыню нават апынулася ніжэй Беларусі. Аднак пахваліцца гэтым Мінск у любым выпадку не можа. Справа ў тым, што гэта краіна займае ўсяго толькі 151-е месца ў свеце, і эксперты арганізацыі «Рэпарцёры без межаў» не бяруцца сцвярджаць, «ці захаваецца выяўленая тэндэнцыя». Смерць Алега Бебеніна можа толькі ўзмацніць іх сумневы.

**«Sueddeutsche Zeitung» (Германія)**

Рызыкну выказаць здагадку, што кактэйлі Молатава ў адрас расійскага пасольства сталі толькі першай акцыяй тых радыкальна настроеных прыхільнікаў цяперашняй улады, якія выступаюць за падаўжэнне паўнамоцтваў цяперашняга кіраўніка дзяржавы. Яны робяць стаўку не на правядзенне выбараў, якія хоць і будуць у канчатковым выніку прайграныя, але пакідаюць хоць нейкую магчымасць афіцыйнаму Мінску «захаваць твар», а на ўвядзенне рэжыму надзвычайнага становішча. Разам з тым, зразумела, што гэта толькі размінка перад боем. Тыя сілы, якія стаяць за нападам на расійскае пасольства, разумеюць, што для таго, каб і далей дэстабілізаваць сітуацыю ў краіне, і тым самым вымусіць улады ўвесці надзвычайнае становішча, будуць патрэбныя дадатковыя акцыі. Пры тым яны павінны будуць ісці па нарастаючай.

**«Regnum» (Расія)**

Адносіны паміж Мінскам і Масквой няўхільна пагаршаюцца з тых часоў, як Уладзімір Пуцін вырашыў адмовіцца ад льготных тарыфаў на расійскія нафту і газ для Беларусі. Аж да 2007 года Мінск набываў нафту па танных коштах, і частку яе перапрацоўваў для далейшага перапродажу на еўрапейскім рынку. Гэта залатое дно дазволіла Лукашэнку адмовіцца ад рызыкоўных эканамічных рэформаў і адначасова забяспечыць сабе палітычнае даўгалецце. Зараз, калі былыя расійскія саюзнікі ўзялі яго за горла, напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў, прызначаных на будучы год, становішча ў Лукашэнкі вельмі няпростае. Ён шукае новых партнёраў, купляе нафту ў Венесуэлы і заяўляе пра імкненне нармалізаваць адносіны з ЕС і нават з Амерыкай, якая прысвоіла яму тытул «апошняга дыктатара Еўропы».

**«Le Figaro» (Францыя)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ЗША. УЗДЫМ КАМУНІСТЫЧНАГА РУХУ



Усе ведаюць, што ў ЗША вельмі не любяць камуністаў. Таму, нават нягледзячы на крызіс, для шмат каго нечаканым стаў цяперашні рэнесанс партый левага радыкальнага кшталту. Здаецца, такога феномену тут не бачылі з 1960-х гадоў, калі моладзевымі кумірамі былі Чэ Гевара і Мао Цзэдун. Лепшым прыкладам з'яўляецца ход выбарчай кампаніі ў Палату прадстаўнікоў і парламенты штатаў. У некаторых штатах левыя маргіналы нечакана здолелі сабраць колькасць подпісаў, неабходную для рэгістрацыі ў якасці кандыдатаў. Так, у штаце Вермонт аж сем актывістаў Сацыялістычнай партыі сабралі патрэбныя для рэгістрацыі 500 подпісаў. У Паўднёвай Караліне ўсе перадвыбарчыя фармальнасці пераадолеў кандыдат ад Партыі рабочых сямей. Тое ж самае ўдалося лідэру групоўкі «Сацыялістычная акцыя» ў штаце Мэн. Тут таксама даўно не бачылі чырвоных кандыдатаў, а менавіта з 1960 года. Праўда, нягледзячы на ажыўленне радыкальных левых настрояў у амерыканскім грамадстве, шанцаў перамагчы на выбарах у прадстаўнікоў камуністычнай плыні вельмі мала. Лічыцца, што кандыдаты, якія лявей за дэмакратаў, маюць шанцы толькі ў двух штатах: Вісконсін і Арканзас. Прычым гэта не марксісты-ленінцы, а прадстаўнікі Партыі Зялёных, якіх падтрымалі прафсаюзы і мацярынскія асацыяцыі.

**Па матэрыялах «Green Left Review» (Аўстралія)**

### ВЕНЕСУЭЛА. АПАЗІЦЫЯ АТРЫМАЛА ПАКУТНІКА



Франклін Брыта — фермер, у якога ў рамках дзяржаўнай аграрнай рэформы ў 2003 годзе канфіскавалі 229 гектараў зямлі. Рэформа была ініцыяваная асабіста Уга Чавесам. У адказ былы фермер не так даўно абвясціў галадоўку, патрабуючы свае гектары назад. З невялікімі перапынкамі яна цягнулася 6 месяцаў. У выніку ён стаў важыць менш 40 кілаграмаў і, як трэба было чакаць, памёр. На працягу ўсёй галадоўкі ўлады адмаўляліся вярнуць канфіскаванае. Міністр сельскай гаспадаркі назваў учынак сеньёра Брыта «валютарыстычнай выхадкай». Так ці інакш, нябожчык адразу стаў сімвалам апазіцыі. На пахаванні Брыта прысутнічалі актывісты партыі Дэмакратычны саюз, які праводзілі яго ў апошні шлях словамі: «Адпачывай! Мы працягнем барацьбу». Апазіцыянеры таксама збіраюцца скардзіцца ў адпаведныя судовыя органы на тое, што ўлады ўсе 6 гадоў запар ігнаравалі пратэсты фермера.

**Па матэрыялах «El Pais» (Іспанія)**

### ЛІВІЯ. ЗЛУЧАНЫЯ ШТАТЫ АФРЫКІ



Муамар Кадафі зноў загарэўся ідэяй стварэння Злучаных Штатаў Афрыкі, куды павінны ўвайсці ўсе дзяржавы Чорнага кантынента. Увогуле, ён даўно марыць пра такое аб'яднанне, якое, па яго словах, дасць Афрыцы шанец развівацца без Захаду. Парадаксальна, але на першы погляд абсалютна не практычная ідэя падабаецца шмат якім мясцовым урадам. Увесь сакрэт у тым, што Трыпалі, які багацее на экспарце нафты, дае аматарам Афрыканскіх Штатаў грашовую дапамогу. На гэтым тыдні ва Угандзе адбудзецца наступны саміт Афрыканскага Саюза — паводле пачатковай ідэі, пераходнай каардынацыйнай структуры. Напярэдадні Кадафі нечакана заявіў, што краіны — удзельніцы сустрэчы «блізкія да стварэння адзінай афрыканскай адміністрацыі». У гэта, аднак, верыцца вельмі слаба. Хаця б таму, што зараз Афрыка адзначае 50-ю гадавіну так званага года Афрыкі. Годам Афрыкі прызвалі 1960-ы за тое, што большасць былых афрыканскіх калоній тады атрымалі незалежнасць. Юбілей паўсюдна выклікаў буйную нацыяналістычную істэрыю вакол гістарычнага значэння тых падзей. Наўрад ці ў такой грамадскай атмасферы лідэры афрыканскіх краін дадуць згоду перадаць частку суверэнітэту наддзяржаўным структурам пакуль мала каму зразумелага фармавання.

**Па матэрыялах «Le Monde» (Францыя)**

---

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ПАДАРУНАК АД ТЭРАРЫСТАЎ

*Алег НОВІКАЎ*

**На 50-ю гадавіну свайго дня нараджэння ЕТА — арганізацыя прыхільнікаў незалежнасці Краіны Баскаў — зрабіла іспанцам сюрпрыз. Сепаратысты заявілі пра аднабаковае прыпыненне вайсковых дзеянняў.**




Відэа з заявай з'явілася на канале брытанскай службы ВВС, журналісту якой невядомыя перадалі запіс у адным з лонданскіх кафэ. На стужцы тры чалавекі ў масках. Доўгі час яны паліваюць брудам усю іспанскую палітычную эліту і праслаўляюць ЕТА, якая «на працягу 50 гадоў арганізуе грамадскую супольнасць на барацьбу супраць гвалту і стратэгія знішчэння». Пасля доўгай прэлюдыі нарэшце прамаўляецца галоўная фраза пра тое, што арганізацыя сепаратыстаў адмаўляецца ад вайсковых дзеянняў на некалькі месяцаў. У дадатак Мадрыду быў прапанаваны дыялог. Выступоўцы таксама адзначылі, што адзіным выйсцем з крызісу можа быць «шырокі дэмакратычны працэс».

«Патрэбны дэмакратычны працэс, які даў бы слова народу. Толькі тады, калі баскскай нацыі будуць дадзеныя правы і гарантыі, з'явіцца магчымасць рашэння канфлікту», — сказаў адзін з герояў запісу.

Ролік, які адразу з'явіўся ж на YouTube, пабіў на Пірэнеях усе рэкорды па прагляду. Яго актыўна каментуюць, аналізуюць. Падключыліся нават эксперты, здольныя па тэмбру голасу вызначаць псіхічны стан чалавека. Па іх словах, тэмбр галасоў тэрарыстаў кажа пра тое, што яны ахопленыя фрустрацыяй.

Галоўныя аспекты шматлікіх каментарыяў наступныя: што прымусіла тэрарыстаў зрабіць такога кшталту заяву, як павінен рэагаваць урад на крокі тэрарыстаў і як гэта заява адлюструецца на сітуацыі ў Краіне Баскаў. Тут, нагадаем, дзейнічаюць драконаўскія законы супраць нацыяналістаў з накірунку гэтак званых izquierda abertzale (левыя патрыёты). Іх партыя «Батасуна» пазбаўлена рэгістрацыі за сімпатыі да ЕТА, яе былым лідэрам забаронена выступаць публічна, а сябрам нельга ствараць новыя выбарчыя ініцыятывы.

Трэба адзначыць, што падобныя заявы пра прыпыненне вайсковых аперацый ЕТА рабіла за 50 гадоў існавання восем разоў. Апошні раз мір наступіў у 2006 годзе. Прычым тэрарысты казалі пра «перманентнае перамір'е». І кожны раз, вытрымаўшы паўзу, зноў пачыналі падкладваць бомбы. Так, перманентнае перамір'е 2006-га закончылася тэрактам у мадрыдскім аэрапорце Barajas, вынікам якога стала смерць двух чалавек.

Аднак на гэты раз да дэкларацыі баявікоў ставяцца больш уважліва. Яна стала сімвалічным эпілогам серыі сумесных іспанска-французскіх контртэрарыстычных аперацый. У іх выніку за краты трапілі 32 актывіста групоўкі, уключаючы шэсць кіраўнікоў. Таксама, як сцвярджае іспанскі МУС, была разбураная сетка ў Францыі, створаная тут яшчэ ў часы Франка.

Тэрарысты спрабавалі сунуцца ў Партугалію, аднак эміграваць не ўдалося. Мясцовая паліцыя выкрыла цэх па вытворчасці бомбаў і два склады са зброяй. Ходзяць чуткі, што новай базай ЕТА можа стаць Венесуэла. Як бы тое ні было, нацыяналістычнаму падполлю нанесены моцны ўдар. За апошні год ЕТА не арганізавала ніводнай вылазкі. Застаўся не рэалізаваным план замаху на караля Хуана Карласа, які па словах іспанскага МЗС, тэрарысты планавалі на канец мінулага года.

Менавіта ў логіцы апісаных падзей каментуюць заяву ЕТА прадстаўнікі іспанскага ўраду. Дырэктар дэпартаменту ўнутраных спраў кажа: «ЕТА не заставалася нічога іншага, як зрабіць падобны крок». Такі падыход вызначае форму рэакцыі ўладаў на прапановы тэрарыстаў наконт дыялогу. Ніякіх перамоў. Толькі капітуляцыя.

Варта прызнаць, што такая пазіцыя пасуе настроям часткі іспанскага грамадства. Аўтар перадавога артыкула ў штодзённіку «El Pais» задаецца пытаннем: «Чаму яны прыпыніліся зараз? Відавочна, таму што разумеюць: заканчваецца бензін і лепш зрабіць выгляд, быццам самі прыпынілі машыну, чым яна рана ці позна спыніцца».

Баскскія нацыяналісты, між тым, дружна віталі словы ЕТА пра перамір'е і неабходнасць дэмакратычнага працэсу. На іх думку, зроблены рашучы крок у напрамку панавання грамадзянскага міру.

Пры гэтым яны схіляюцца да той думкі, што тэрарысты пайшлі на саступкі не таму, што ЕТА спужалася паліцэйскіх. Раней лідэраў ЕТА сапраўды арыштоўвалі ўжо шмат разоў, аднак арганізацыя ўпарта існавала. Папросту быццам тэрарысты зразумелі бесперспектыўнасць васковай стратэгіі, заложнікам якой стаў нацыяналістычны трэці сектар.

Сапраўды, выключэнне ў 2003 годзе «Батасуны» з палітычнага працэсу прывяло да з'яўлення новых нацыяналістычных праектаў, не звязаных з традыцыяй izquierda abertzale. Напрыклад, партыя Aralar, лідэры якой адмоўна ставяцца да ЕТА, змагла ў 2008 годзе прайсці ў рэгіянальны парламент. Дадатковы фактар для таго, каб скласці зброю, — працэсы ў Каталоніі. Каталонцы ніколі не мелі такога моцнага ўзброенага руху за незалежнасць, як баскі. Аднак цяперашні Статут Каталоніі дае краю значна больш правоў у рамках іспанскай дзяржавы, чым Краіне Баскаў.

Раней з'явілася інфармацыя пра тое, што izquierda abertzale зрабіла кіраўнікам ЕТА ўльтыматум, патрабуючы прыпынення васковых акцый. Да іх далучыліся 700 баскскіх нацыяналістаў, якія зараз сядзяць у іспанскіх турмах. Калі верыць прэсе, кіраўніцтва былой «Батасуны» хоча выставіць свой спіс кандыдатаў на камунальных выбарах, якія прызначаныя на наступны май. У час, калі «Батасуна» дзейнічала легальна, нацыяналісты стабільна збіралі на месцах да 10 працэнтаў галасоў.

У любым выпадку, нацыяналісты паспрабуюць навязаць Мадрыду нейкую форму дыялогу. Ужо з'явілася інфармацыя пра пачатак кансультацый вядучых баскскіх партый на гэты конт.

Але з тым дыялогам ёсць адна вялікая праблема. Каб дабіцца міру ў рэгіёне, трэба пазбавіць тэрарыстаў легітымнасці ў вачах грамадства. А зрабіць гэта цяжка, асабліва з улікам вынікаў рэферэндуму 1977 года па праекту іспанскай канстытуцыі, якая таксама вызначала палітычныя правы баскскага народу. Большасць баскаў тады прагаласавалі супраць праекту. Па логіцы, трэба правесці новае ўсенароднае апытанне і такім чынам канчаткова перавярнуць гэту старонку гісторыі. Але на праўдзенне рэферэндуму па пытанню незалежнасці Краіны Баскаў Мадрыд дакладна не пойдзе.

ВІЗІТ

# ЛЕПШ БЫ ПАПА ПАЕХАЎ У СССР

Алег НОВІКАЎ



**У сярэдзіне верасня Папа Рымскі Бенедыкт XVI пачынае афіцыйны візіт на Туманы Альбіён. Скандалы гарантаваныя.**

Апісваючы грамадскую атмасферу, якая пануе ў Вялікабрытаніі напярэдадні прыезду Папы Рымскага, журналісты згадваюць часы «халоднай вайны». Тады, асабліва ў перыяды разрадкі, час ад часу ўсплывала тэма магчымага візіту Папы Рымскага ў Маскву. Правая прэса рэагавала на падобныя спекуляцыі матэрыяламі пра тое, якія цяжкасці і жахі чакаюць пантыфіка ў краіне саветаў. Аднак сёння шмат хто ў журналісцкіх колах, згадваючы тыя публікацыі, прызнае: візіт Папы ў СССР, калі б ён меў месца, прайшоў бы значна спакайней, чым запланаванае на сярэдзіну верасня турнэ.

Уся прагрэсіўная грамадскасць Вялікабрытаніі знаходзіцца ў стане падрыхтоўкі антыпапскіх пратэстаў. Усе чакаюць з'яўлення ў краіне пажылога невялікага мужчыны, каб выставіць яму рахунак за шматлікія грахі.

Спектр брытанскіх прэтэнзій да Папы Рымскага неабсяжны. Пачаць апісваць яго можна з флангу гомасексуалістаў, якія даўно ператварылі Лондан у сваю Мекку.

Зразумела, што ім не падабаецца катэгарычна адмоўная пазіцыя святога пасаду адносна аднаполага сексу.

**У мінулым годзе ў Ватыкане пабачыў свет спецыяльны дакумент «Anglicanorum coetibus», які рэгулюе працэдуру пераходу англікан у каталіцтва і нават вітае такія пераходы**

Акрамя таго, брытанскія геі не могуць прабачыць касцёлу паслядоўнай пазіцыі ў пытанні, ці могуць аднаполыя пары выхоўваць дзяцей. Пачынаючы з 2005 года лесбійскія і гомасексуальныя пары ў Вялікабрытаніі па закону могуць браць дзяцей на выхаванне з інтэрнатаў. Аднак каталіцкія інтэрнаты адмаўляюцца аддаваць дзяцей у такія сем'і. Дакладней сказаць — адмаўляліся. Вышэйшы суд прызнаў гэта парушэннем заканадаўства. У адказ каталікі вырашылі ўвогуле зачыніць сваю сетку інтэрнатаў. Цікава, што прэса палічыла гэтае рашэнне ні чым іншым, як актам дыскрымінацыі геяў.

«Крыві» Папы таксама жадаюць абаронцы правоў дзяцей. Яны заклікаюць арыштаваць Папу адразу па прылёце і тут жа павесіць на яго адказнасць за ўсе выпадкі педафіліі ў каталіцкіх школах.

Будуць пратэставаць і атэісты. Англія лічыцца краем з самым нізкім працэнтам вернікаў у Еўропе. Толькі тут улады маглі дазволіць атэістычнай арганізацыі Брытанскае таварыства гуманістаў рэкламаваць сябе з дапамогай лозунгу «Здаецца, што Бога няма». Гэты слоган быў напісаны на славутых лонданскіх чырвоных аўтобусах, што дало падставу турыстам з пачуццём гумару казаць пра тое, што Англія — гэта краіна атэістычных аўтобусаў.

Толькі ў Англіі ёсць выпадкі адлічэння з навучальных установаў настаўнікаў за тое, што яны падчас лекцый згадвалі нешта пра Бога. У англійскім праве гэта лічыцца злачынствам, якое называецца «прымушэнне да рэлігійных практык».

Не пройдуць міма і змагары са СНІДам, якія абавязкова ўзгадаюць госцю з Рыма кампанію супраць выкарыстання прэзерватываў у Афрыцы.

Нарэшце, там-сям у краі, асабліва ў Паўночнай Ірландыі, засталіся грамады ваяўнічых пратэстантаў, для якіх стагоддзямі Папа Рымскі — гэта ўвасабленне самага кепскага. Абавязкова будуць узгаданыя ўсе цёмныя і скандальныя старонкі адносін Лондану і Ватыкану: падрыхтоўка змовы Марыі Сцюарт, спроба Іспаніі, якая лічылася ў XVI стагоддзі бастыёнам каталіцкай веры, захапіць астравы з дапамогай Вялікай Армады і г.д.

Ну і, натуральна, размова пойдзе пра рэфармацыю ў Англіі, якая адбылася ў выніку прыняцця ў часы караля Генрыха VIII Акту пра супрэмацыю 1534 года. Гэты закон надаў англійскім манархам функцыі главы Англіканскай царквы. Пасля гэтага шлях Папам Рымскім у Аб'яднае Каралеўства быў зачынены.

Паляпшэнне адносін пачалося толькі ў 1980-х гадах. У 1982 годзе, упершыню за 450 гадоў з моманту аддзялення англіканскай царквы ад рымска-каталіцкай, Папа Рымскі Ян Павел II сустрэўся з архібіскупам Кентэрберыйскім і зрабіў з ім сумеснае набажэнства. Нарэшце ў часы лейбарыстаў Тоні Блэр, які з часам прыняў каталіцтва, дамовіўся пра гэты візіт.

З улікам усіх прыведзеных вышэй негатыўных фактараў, Папе, здаецца, было б лепш застацца ў Рыме.

Аднак, магчыма, менавіта гэта акалічнасць — франтальная атака брытанскіх атэістаў на царкву — і дае Папе шанец вярнуць Англію ў лона апостальскай царквы або прынамсі наблізіць да яе.

Па-першае, візіт Папы можа стаць вырашальным для шматлікіх пратэстанцкіх вернікаў. Апошнія рэформы ў англіканскай царкве — права абіраць біскупамі жанчын, талерантнае стаўленне да тых жа гомасексуаліста — нарадзілі ў прыходах унутраную кансерватыўную апазіцыю. Ідзе вострая палеміка. Часам артадоксы думаюць: а ці не кінуць дурную спрэчку з мадэрністамі і не пайсці ў касцёл?

Папа гатовы ісці ім насустрач. У мінулым годзе ў Ватыкане пабачыў свет спецыяльны дакумент «Anglicanorum coetibus», які рэгулюе працэдуру пераходу англікан у каталіцтва і нават вітае такія пераходы. Каталіцкая прэса піша, што Касцёл можа атрымаць у Англіі 400 тысяч былых прыхільнікаў рэфарматарскай царквы. Нядзіўна, што цэнтральным фрагментам праграмы папскага візіту да англічан стане наданне сану святога Джону Генры Ньюману. Ньюман пачынаў як пратэстанцкі святар, а пасля перайшоў у каталіцызм.

Па-другое, Папа будзе выступаць у час пілігрымкі як сімвал дыялогу паміж цэрквамі, што надае яму імідж галоўнага абаронцы хрысціянства.

У Бенедыкта XVI таксама запланаваны сустрэчы з каралевай Лізаветай II, а таксама з архібіскупам Кентэрберыйскім Роуэнам Уільямсам. Пантыфік таксама мае намер правесці набажэнствы ў шматлікіх брытанскіх гарадах і выступіць у парламенце.

Застаецца спадзявацца, што гэты візіт будзе паваротным у кадэнцыі Бенедыкта. Нарэшце ўсе забудуць пра педафільскі скандал і будуць згадваць Папу як чалавека, які аб'ядноўвае католікоў і англікан.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ



### СЯРГЕЙ ЦІГІПКА

Здаецца, менавіта лідэра партыі «Моцная Украіна», віцэ-прэм'ера па пытаннях эканомікі Сяргея Цігіпку ва ўрадавых кулуарах рыхтуюць на ролю галоўнага кішэннага апазіцыянера. Пра гэта сведчаць дзве падзеі. Спачатку аўтарытэтнае сацыялагічнае агенцтва Разумкова апублікавала вынікі апытання наконт даверу да палітычных сіл. Адпаведна ім, рэйтынг Януковіча і яго каманды за апошнія тры месяцы рухнуў з 43 да 27 працэнтаў. Гэта яшчэ не катастрофа (у Юшчанкі рэйтынг апошні год знаходжання на Банкаўскай вуліцы не быў вышэйшым за 7 працэнтаў), аднак дастаткова трывожны сігнал. Тым больш, што з восені пачнецца павышэнне коштаў на камунальныя паслугі. Першай рэакцыяй улады на кепскую навіну чамусьці сталі папраўкі ў Закон аб мясцовых выбарах. Па першапачатковаму варыянту выстаўляць кандыдатаў маглі партыйныя суполкі, якія былі зарэгістраваныя як мінімум за год да выбараў. Такая норма была накіраваная супраць маладых палітычных лідэраў Цігіпкі, Яцэнюка і Грыцэнкі, партыйныя структуры якіх толькі ствараюцца. І пасля гэтага Януковіч нечакана адмяняе пункт пра абмежаванні для партый. Эксперты аднагалосныя: Віктар Фёдаравіч хоча, каб Цігіпка набраў больш месцаў і стварыў добры плацдарм да будучых парламенцкіх выбараў. Калі рэйтынг даверу да Партыі рэгіёнаў будзе падаць і далей, да Сяргея Цігіпкі пойдуць былыя выбаршчыкі Партыі рэгіёнаў. Іншыя эксперты кажуць нават, што Цігіпку будзе адведзеная яшчэ большая роля. Быццам на Украіне ствараецца падобная на расійскую партыйная сістэма, дзе роля «Адзінай Расіі» дастанецца бела-блакітным, а «Справядлівай Расіяй» стане «Моцная Украіна».

### АЛЕКС САЛМОНД



Прэм'ер-міністр аўтаномнай Шатландыі, лідэр партыі нацыяналістаў можа атрымаць мянушку шатландскі Гарбачоў. Нацыяналісты, якія плануюць у хуткім часе правесці рэферэндум аб пачатку выхаду краю са складу Вялікабрытаніі, пайшлі на смелую рэформу. Імі прадстаўлены ў парламент план па барацьбе з алкагалізмам. Закон можна параўнаць са славутым указам Гарбачова 1985 года. Яго галоўная фішка — цана на алкаголь будзе паднятая ў тры разы. Прычым рэформа будзе тычыцца алкагольных напояў у супермаркетах, дзе іх звычайна з-за нізкіх коштаў набываюць бедныя людзі. Такім чынам, нацыяналісты збіраюцца захаваць здароўе нацыі і адначасова палепшыць статыстку злачынстваў, на якія беднякоў той самы алкаголь, па іх словах, і штурхае. Крытыкі кажуць, што рост коштаў на алкаголь прывядзе да стварэння чорнага рынку. Тым больш, што побач Англія, дзе кошты застануцца старымі. Застаецца дачакацца, як новы закон адлюструецца на папулярнасці нацыяналістаў і ідэі незалежнасці ад Лондану. Увогуле, шатландскія нацыяналісты — цікавыя палітыкі. Раней яны прынялі закон пра якасць яек і патрабавалі ад бацькоў абавязкова забіраць сваіх дзетак са школай.

### КЕН УІЙЯТ

Сябра аўстралійскай партыі лібералаў стаў першым у гісторыі 5-га кантыненту абарыгенам, які атрымаў мандат дэпутата парламента. Больш таго, ад яго і яшчэ чатырох кандыдатаў ад малых партый залежала, лейбарысты або кансерватары сфармуюць кабінет. Ні першыя, ні другія не сабралі большасці. Сам Кен заявіў, што ў дзень галасавання аддасць голас за лейбарыстаў, паколькі менавіта гэтая партыя раней папрасіла прабачэнне за практыку, калі дзяцей гвалтоўна забіралі ў абарыгенаў і аддавалі ў інтэрнаты. Яго родныя таксама перажылі гэту трагедыю. Такое рашэнне каштавала яму нерваў. На парламентарыя абрушылася плынь ананімных паведамленняў і тэлефонных званкоў з пагрозамі. А паколькі дэпутат мае не белую скуру, пагрозы часта былі расісцкага характару. Самае цікавае, што да кампаніі ціску кансерватары падключылі і тубыльцаў. Прычым з таго самага племені, адкуль ён паходзіць. Яны заявілі, што Кен прадаў іх інтарэсы каланізатарам, што ён, як какос, — звонку чорны, унутры белы. Уся гісторыя закончылася пасля таго, як парламент дзякуючы галасам дэпутатаў ад малых партый аддаў права фармаваць урад лейбарыстам. Аднак асадак ад гэтай гісторыі ў Кена застаўся. Па яго словах, ён вельмі расчараваўся ў родным племені.



СПАДЧЫНА

# МЕРА АДКАЗНАСЦІ

Аляксей ХАДЫКА

**Тэма рэстаўрацыі і захавання помнікаў беларускай архітэктурнай спадчыны і звязаныя з ёй юрыдычныя і маральныя аспекты зрабіліся прадметам абмеркавання ток-шоў «Выбар» на ОНТ. На праграме атрымалі слова прадстаўнікі арганізацый з рознымі, часам палярнымі, поглядамі на праблему. Той, хто меў магчымасць сачыць за размовай у студыі, памятае: пагаднення бакам дасягнуць не ўдалося.**



Касцёл Вітаўта перабудаваны ў царкву пасля рэканструкцыі 1896–1899 гг.


Палац у Падгорцах на малюнку Яна Матэйкі



Фарны касцёл у Гродна на гравюры Томаша Макоўскага 1600 г.

## Храм для вернікаў

Касцёл святога Іосіфа кляштара бернардынцаў, заснаванага ў цэнтры Мінска ў 1624 годзе, — старэйшы каталіцкі храм сталіцы, па-ранейшаму застаецца ва ўласнасці размешчанага ў ім дзяржаўнага архіва літаратуры і мастацтва. За вяртанне касцёла ўжо шосты год запар пад яго сценамі моліцца абшчына вернікаў, сабраўшы і перадаўшы прэзідэнту краіны яшчэ ў 2007 годзе больш 30 тысяч подпісаў.

Справа з месца пакуль не рушыцца. Больш за тое, кляштарныя будынкі, якія зараз рэстаўруе КУП «Мінская спадчына», мяркуецца прыстасаваць пад гасцініцу (каб годна прыняць, па словах Міхаіла Жыха, гасцей чэмпіянату свету па хакеі–2014). А гандлёвыя рады часткова музеефікаваць.

З 1863 года, пасля якога дзяржава забрала будынкі ў манахаў у пакаранне за іх прыхільнае стаўленне да ідэй Кастуся Каліноўскага, у іх размяшчаліся і суд, і ваенная камендатура, і пракуратура. Тэзіс Богу — Богава не спрацоўвае. Вяртанне гісторыка-архітэктурнаму комплексу яго першаснага прызначэння, насуперак просьбам вернікаў, нашчадкаў былых гаспадароў, адпрэчваецца. Аргументацыя дзяржаўных чыноўнікаў простая: мы ўкладаем у будынкі камунальныя грошы (як быццам горад і дзяржава паўтара стагоддзя не карысталіся не належнай ім па праве ўласнасцю), і таму хочам пакінуць касцёл з кляштарам у сваім распараджэнні. Маўляў, толькі дзяржаўныя арганізацыі могуць забяспечыць навуковае аднаўленне старых сцен.

Але будзем спадзявацца: зварот да тэмы зберажэння помнікаў, вельмі істотнай для захавання на беларускай зямлі для нас і нашых нашчадкаў культурнай аўры, атрымае працяг і ў дзяржаўных СМІ, і ў практыцы адказных за вырашэнне пытання ўстаноў.

## Адказаў няма

Пакуль жа неабыякавыя ўдзельнікі «Выбару» выказваюць хутчэй расчараванне. Кіраўнік Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Антон Астаповіч, які пракаментаваў сітуацыю для «НЧ», з сумам адзначае: «Перадача «Выбар» адбылася не па сцэнары Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Чыноўнікі не адказалі на пытанні ні датычна гістарычнага цэнтра Мінска, ні датычна льгот, якія павінны суправаджаць працы розных арганізацый на гісторыка-культурных каштоўнасцях».

У працяг перадачы Астаповіч выступіў з дакладам на міжнароднай канферэнцыі па кансервацыі і рэстаўрацыі будынкаў, арганізаванай Беларускім саюзам будаўнікоў і «Строительной газетой» 25 жніўня. У форуме бралі ўдзел прадстаўнікі міністэрстваў архітэктуры і будаўніцтва, культуры, Дзяржкантролю. На падставе прыкладаў па гістарычным цэнтры кіраўнік таварыства аховы помнікаў чарговы раз давёў, што нарматыўна-прававая база пры работах з аб'ектамі, якія фармальна ахоўваюцца дзяржавай, ігнаруецца — пры пасіўнай падтрымцы кантрольна-рэвізійных і праваахоўных органаў. На жаль, і гэтым разам пасля выступлення ніхто з чыноўнікаў не задаў ніводнага пытання. Ніяк не адрэагаваў.

Як жа павінна выглядаць адказнасць дзяржавы за стан аб'ектаў, даўно атрыманых ці, часцей, гвалтоўна забраных ёй у папярэдніх гаспадароў? Як там ні было, дзяржаўныя органы і арганізацыі мусяць прызнаваць прававпераемнасць сваіх маёмасных правоў і адказнасці за карыстанне аб'ектамі.

Эксплуатацыя будынкаў-помнікаў цягам дзесяцігоддзяў, якая даводзіць іх да стану руінаў, мусіць цягнуць пэўныя наступствы. Або ў выглядзе абавязкаў нарошчэ пра іх паклапаціцца, альбо ў адмове ад нахабнага жадання атрымаць вялікія грошы, калі гістарычны аб'ект выстаўляецца на аўкцыён у пошуках новага ўладара, інвестара, а дакладней выратавальніка. Амаральна шукаць выгады там, дзе ў якасці сплаты матэрыяльных і маральных запазычанасцяў дзяржавы новым (якія часам супадаюць са старымі) гаспадарам трэба прадставіць ільготы.

## Руйнаваць — не будаваць

Зноў і зноў паўстае пытанне пра маральнасць. У выпадках часам надзвычай выразных, балючых, невытлумачальных з пункту гледжання элементарнай этыкі і культуры, калі гаворка ідзе пра знішчэнне помнікаў. Такіх, як старажытная гарадзенская фара Вітаўта — касцёл Дзевы Марыі. Помнік узарваны ў 1961 годзе. Ён паўстаў як драўляны храм у 1389 годзе па фундацыі Вітаўта ў яшчэ суцэльна праваслаўнай Гародні, быў рэканструяваны ў 1494-м і 1551-м з ласкі вялікага князя Аляксандра і каралевы Боны. Новая адбудова з цэглы выконвалася пад патранажам улюбёнага ў горад Стэфана Баторыя ў 1584–1587 гадах італьянскім архітэктарам Антоніем Дзікрыпам у рэнесансным стылі з элементамі готыкі. У гэтым выглядзе храм захаваўся для нашчадкаў на вядомай гравюры знакамітага Томаша Макоўскага 1600 года.

Пажары, разбурэнні горада, расійская акупацыя пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, у выніку якой касцёл пераўтварыўся ў 1804 годзе ў праваслаўную царкву, разам з далейшымі перабудовамі непазнавальна змянялі яго вонкавае аблічча. Але ён ганарліва ўзносіўся на плошчы побач з езуіцкім касцёлам і ратушай. Вернуты ў 1918 годзе каталікам у якасці гарнізоннага касцёла, ён перажыў не зусім дакладныя рэстаўрацыі-рэканструкцыі архітэктараў В. Генберга (1923) і А. Сасноўскага (1935), набыўшы падкрэслена гатычныя рысы.

Але ва ўсе часы заставаўся візітоўкай Гародні, адлюстраваны на шматлікіх гравюрах, карцінах, паштоўках. Пакуль у Гародню ў 1939 годзе не прыйшла савецкая ўлада і не зачыніла касцёл, брутальна ператварыўшы яго ў склад. Затым надышлі часы Хрушчова, калі ў Беларусі распраўляліся не толькі з нацыянальнай мовай і культурай. Будаўнікам новага ладу перашкаджала вера і старажытныя храмы. У 1961 годзе выбухнула ўнікальная Дабравешчанская царква XII стагоддзя ў Віцебску. Дайшла чарга і да фары Вітаўта.

Калі нехта скажа, што людзі не супраціўляліся варварству, гэта няпраўда. Вялізны натоўп, сабраўшыся ў суседнім езуіцкім касцёле, не дапусціў яго знішчэння ў тыя ж самыя гады. З фарай Вітаўта савецкія герастраты паступілі больш жорстка: калі прыехала ленінградская брыгада падрыўнікоў, каб не дапусціць хваляванняў і беспарадкаў у горадзе, касцёл абкружылі аўтаматчыкі. Людзі, што прыйшлі на плошчу, чулі, як салдатам аддавалі загады страляць на паражэнне ў выпадку супраціву. 29 лістапада ўначы храм узняўся ў паветра і асеў вялізнымі глыбамі друзу ў аблоках чырвонага пылу. Улада баялася помсты: доўгія гады пасля вайсковая варта ахоўвала размешчаны непадалёк мост праз Нёман — пайшла чутка, што яго ўзарвуць у адказ за знішчэнне святыні. Чыноўнікі, якія падпісалі храму прысуд, — дырэктар краязнаўчага музея Собаль, намеснік старшыні выканкама Тупоўскі, архітэктар горада Маркаян. Двух апошніх потым выкінулі з працы, як скарыстаныя паперкі, каб супакоіць народ. Але фары Вітаўта ўжо не было.

Улада ўжо незалежнай Беларусі, быццам адчуваючы пераемнасць ад савецкіх дзікуноў, не толькі не спрые, але супраціўляецца ініцыятывам грамадзян па аднаўленні храмаў. Не зарэгістравана заснаванае ў 2000 годзе з мэтай адбудовы фары Вітаўта і падтрымання стану іншых помнікаў горада грамадскае аб'яднанне «Гарадзенскія муры». Неаднаразова знішчаліся высаджаныя грамадзянамі на месцы фары Вітаўта кветкі. Экскаватарам вывозілі камяні, якімі людзі спрабавалі пазначыць малюнак плана алтарнай часткі былой святыні. Знішчалася пастаўленая на яе месцы памятная табліца і мемарыяльны крыж. На сённяшні дзень ідэя аднаўлення храма не атрымала працягу.

## Украінскі напамін

Напачатку 1990-х гадоў аўтар гэтых радкоў разам з гісторыкам мастацтва Аляксандрам Ярашэвічам прысутнічаў на канферэнцыі на Украіне ў Алескім замку, філіяле Львоўскай карціннай галерэі непадалёк ад Львова. Дырэктар галерэі, Барыс Рыгоравіч Вазніцкі, які дзесяцігоддзямі ратаваў абразы, скульптуру і іншае начынне з занядбаных у тыя часы храмаў, гасцінна запрасіў у фондасховішча, аформленае як дадатковая экспазіцыя.

Збор з соцень і соцень твораў мастацтва адчынялі 4 старажытныя, XVI стагоддзя, драўляныя фігуры апосталаў. «Яны з Беларусі», — заўважыў дырэктар і распавёў гісторыю, у якую цяжка было паверыць. У 1979 годзе здымачная група «Беларусьфільма» на чале з рэжысёрам Валерыем Рубінчыкам у пашкоджаным часам, але тым не менш шыкоўным палацы XVII стагоддзя Канецпольскіх-Жэвускіх у Падгорцах, размешчаных у 5 кіламетрах ад Алеска, вяла здымкі фільма «Дзікае паляванне караля Стаха» па аповесці Уладзіміра Караткевіча. Пасля здымкаў на снезе пад сценамі палаца засталіся 4 старажытныя скульптуры апосталаў, прывезеныя «Беларусьфільмам» у якасці студыйнага рэквізіту і без усялякага спачування пакінутыя кінематаграфістамі на знішчэнне. Скульптуры ўратавалі простыя жыхары Падгорцаў, патэлефанаваўшы ў музей Вазніцкаму, калі невядомыя нягоднікі ўжо спілавалі на адной з постацяў галаву.

Тады, у 1990-я, Барыс Вазніцкі прапаноўваў зрабіць высакародны крок — вярнуць скульптуры ў Беларусь. І ўжо тады ў даследчыкаў паўставала думка: ці не звязаныя разьбяныя постаці — па часе іх паўстання, стылістыцы, вялікім маштабе — з фарай Вітаўта ў Гародні? Пасля знішчэння якой яны маглі трапіць у рэквізіт «Беларусьфільма».

***

«НЧ» паспрабуе прасачыць гісторыю беларускіх скульптур у зборы Алескага музея і паспрыяць, калі магчыма, іх вяртанню на радзіму. І раскажа пра гэта чытачам. Што датычыцца касцёла св. Іосіфа і мінскіх бернардынцаў, то змаганне за храм працягваецца. 4 верасня ўвечары каля чырвонага касцёла святых Сымона і Алены быў затрыманы міліцыяй у час збору подпісаў за вяртанне касцёла св. Іосіфа вернікам лідэр незарэгістраванай партыі хрысціянскіх дэмакратаў Павел Севярынец. Але кожны, хто жадае перамагчы рудыментные супраціўленне сістэмы, аднавіць справядлівасць і маральнасць, мусіць дзейнічаць. І нават прынесціць пэўныя ахвяры. Гэта — выбар.

ФЭСТ

# ВОСЕНЬСКАЯ ТАНАЛЬНАСЦЬ СУЧАСНАГА ФАЛЬКЛОРУ

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**Ужо другі раз запар фэст «Камяніца» становіцца самай заўважнай падзеяй на ўсёй нацыянальнай фальклорнай сцэне. Гэта стала магчымым таму, што да яго ўдзелу былі запрошаны не толькі ветэраны айчыннай фолк-музыкі, але і маладыя, таленавітыя калектывы, якія прадставілі сваё арыгінальнае разуменне нацыянальнага фальклору. Праўда, нярэдка гэта разуменне набывае такія рысы, што размову пра адраджэнне фальклору можна весці з вялікай доляй насцярожанасці. Творчыя працэсы ў айчыннай фолк-музыцы — падстава для аналізу прафесійных фалькларыстаў, мы ж сёння засяродзімся на фестывальных калізіях.**




Гурт «Палац»



Фота аўтара

Гурт «Троіца»



Гурт «Guda»

## Верасень: дождж ці сонейка?

Тыя хто, лічыць сябе ветэранамі «Камяніцы», добра падрыхтаваліся да сюрпрызаў восеньскага надвор'я: слухачы захапілі з сабой цёплае адзенне, гумавыя боты, гарачую каву і харчы, каб не сумаваць пад праліўнымі зацяжнымі дажджамі, якія дадалі столькі незабыўных рысаў мінулагодняй «Камяніцы».

Але і тут прырода ўнесла свае прыемныя карэктывы: кропелькі дажджу толькі ў пачатку фэсту наважыліся выпрабаваць слухачоў на трываласць, але хутка скончыліся, і пяшчотныя сонечныя промні запанавалі над цудоўнымі краявідамі Строчыцы і драўлянымі шэдэўрамі Музею народнай архітэктуры і побыту. Нагадаю, што менавіта кіраўніцтва гэтага музею і ўладальнікі рэстарана беларускай кухні «Камяніца» сталі ініцыятарамі аднайменнага open-air-фэсту, увесь збор ад якога пайшоў на патрэбы беларускага скансена.

## «У нашай нівы да Дажыначкі...»

Слухачы, якія першыя трапілі на фестывальнае поле, горача віталі вядучага «Камяніцы–2010» — лідэра вядомага фолк-мадэрн-гурта «Палац» Алега Хаменку, які і запрасіў на сцэну першага ўдзельніка фэсту. Гонар адчыніць яго праграму выпаў фальклорнаму гурту «GUDA», удзельніцы якога яшчэ раз засведчылі сваё выключнае становішча на ўсёй айчыннай фолк-сцэне. І не толькі дзякуючы ўнікальным старажытным спевам, але і з дапамогай традыцыйных для іх перформансаў паводле каляндарных абрадаў беларусаў.

Гэтым разам выступ «GUDA» быў прысвечаны актуальнаму ў гэтыя дні святу Дажынак, тэатралізаваныя элементы якога вельмі ажывілі праграму фэсту, і слухачы з задавальненнем паўдзельнічалі ў народным абрадзе.

Калі ж над фестывальным полем загучалі рыфы і акорды рок-гурта «Рокаш», слухацкая аўдыторыя яшчэ з большай цікаўнасцю пацягнулася да сцэны. Бо ў выкананні каманды прагучалі такія вядомыя песні, як «Запалі агонь», «Крумкач», «Ваўкалак», «Дух Зямлі», — творы, якія прынеслі гурту папулярнасць у колах аматараў неафолк-музыкі. На адкрытым паветры гэтыя кампазіцыі «Рокаша» загучалі больш аб'ёмна і ўзнёсла-рамантычна. Вялікая заслуга ў тым і вакалісткі гурта Паліны Дуленец, спевы якой надавалі музыцы «Рокаша» эмацыйнасць, артыстызм і экспрэсію.

## Эстафета пераходзіць да гасцей фэсту

Самыя маладыя ўдзельнікі фэсту — гурт «BeFolk» з Гомелю — толькі робіць першыя крокі ад рускамоўнай бардаўскай песні ў бок беларускага фолку. Мо таму на фоне кітоў айчыннай фолк-сцэны творчасць «BeFolk» глядзелася даволі нераспрацаванай. Хоць трэба адзначыць, што некаторыя песні ў выкананні гамяльчан можна было аднесці да ўдалых. Маю на ўвазе кампазіцыю паводле старажытнага фальклорнага твора «Ой, ляцела сіза павушка...», якая сведчыць пра талент выканаўцаў, іх патэнцыял і нераскрытыя магчымасці на айчыннай фолк-сцэне.

Наступны ўдзельнік фэсту «Камяніца» — фолк-гурт «AKANA» — здзівіў яркім сінтэзам фолку і джазу. Слухачы вельмі прыязна сустрэлі салістак «AKANA», і асабліва былую вакалістку гурта «Індыга» Русю. У новым фолк-гурце Русі і яе сяброўкам Ірэне і Надзейцы даводзілася спалучаць фальклорныя матывы з інструментальнай імправізацыяй. Гэтыя эксперыменты выклікалі гарачыя апладысменты ў адрас гурта, асабліва калі «AKANA» выконвала ўжо вядомую па сумеснай працы з джазавым гуртом «Apple Tea» кампазіцыю «Жыта палавее». Дарэчы, гэтай арыгінальнай песняй у інтэрпрэтацыі вакалістак «AKANA» адкрываецца дыск беларускіх выканаўцаў «Messages From Belarus», які не так даўно пабачыў свет у Швецыі. Вось так гурт распачаў шлях да міжнароднага прызнання.

«Металічнай» інструментальнай афарбоўкай адрозніваліся аранжыроўкі фолк-рок гурта з Гомелю «Бан-Жвірба». «Пацяжэлае» гучанне гурта адпавядала канцэпцыі новага альбому «Дагары нагамі», які пабачыў свет у гэтым годзе. Кампазіцыямі «Палынтрава», «Блаславі, маці», «Го-го, каза!» і знакамітай «Канапелькай» гомельскія выканаўцы яшчэ раз пацвердзілі сваё права звацца найярчэйшымі прадстаўнікамі традыцыйнага беларускага фолк-року. Такая прыхільнасць традыцыі дазваляе музыкантам вылучацца на фоне разнастайных «стылістычных вынаходніцтваў» і станавіцца пераможцамі музычных фэстаў і конкурсаў. Нагадаю, што нядаўна гурт «Бан-Жвірба» заваяваў першае месца на фэсце «Рок за бабpoў»...

## Шматаблічны фолк-шансон...

У вядомага мінскага музыканта Леаніда Паўлёнка ўжо маецца даволі шырокае кола прыхільнікаў. На фэсце «Камяніца» летась Леанід прадставіў свой гурт «Нагуаль», рытмічныя песні якога шмат у каго са слухачоў выклікалі неадольнае жаданне пусціцца ў скокі. Гэтым разам Паўлёнак пазнаёміў слухачоў з іншым сваім праектам — гуртом «Маланка Orchestra». Музыка і песні калектыву маюць такія якасці, што будуць успрыняты за свае і ў балканскім нацыянальным асяродку, і ў цыганскім, і ў габрэйскім. Ды і песні ў «Маланка Orchestra» адпаведныя: «За плинтусом», «Лимончики» і гэтак далей.

Што да беларускага фальклорнага кантэксту, то трэба адзначыць: Леанід стараецца надаць свайму праекту некаторыя выразныя нацыянальныя рысы: рыфмуе асобныя тэксты па-беларуску, уводзіць у склад свайго аркестра народныя інструменты. У прыватнасці цымбалы, на якіх віртуозна грае Сяргей Сальнік. Гэтыя нававядзенні дадаюць кампазіцыям беларускі каларыт і большую экспрэсію, якая так захапляе аматараў жвавых танцавальных рытмаў, стварае атмасферу разняволенасці і пазітыву.

Арганізатары дакладана пралічылі і тое, што фестывалю і наладжванню яго святочнай атмасферы дапаможа выступленне вядомага беларускага рок-музыканата Лявона Вольскага. Лявон жа нядоўга шукаў у сваім творчым багажы нешта адпаведнае фальклорнай тэматыцы фэсту «Камяніца».

Таму спачатку выканаўца прапанаваў слухачам узгадаць «Народны альбом» — кампазіцыі з яго «Надзенька», «Казік і Юзік», беларускую народную песню «Сівы конь». А далей пайшлі фантазіі паводле скандынаўскага фолку на верш Максіма Багдановіча «Інгеборга» з апошняга сольнага альбому Вольскага «Белая яблыня грому», пераасэнсаванне ірландскіх мелодый у «Баладзе пра Шэйна-Джэка О'Конэлі і ягоны сіні нос» з «Застольнага альбому» «Крамбамбулі». На «біс» Лявон Вольскі выканаў сапраўдны ўзор сучаснага аўтарскага фальклору — народны хіт «Госці», які заспявалі ўсе тыя, хто ў гэты дзень наведаў музей і фэст.

## «Добры вечар, добры вечар, Талака!»

Хэдлайнерам «Камяніцы» — этна-трыа «Троіца» і фолк-мадэрн-гурту «Палац» нічога не заставалася, як на ўсю моц, на якую здольныя лідэры айчыннай фолк-музыкі, давесці неаспрэчны факт: айчынны фолк — гэта не толькі прыгажосць старажытных мелодый, але і гарманічная іх сугучнасць з самымі сучаснымі стылістычнымі накірункамі ў сусветнай world- і рок-музыцы. Трэба было бачыць, з якой непадробнай цікаўнасцю маладыя прыхільнікі беларускай фолк-музыкі ўслухоўваліся ў сімфонію чароўных гукаў такіх кампазіцый «Троіцы», як «Купальская», «Родзе-родзе», «Ой, бору мой, бору...», «Галя», «Тры янгелы», спрабавалі адчуць і зразумець канцэптуальныя задумы музыкантаў у новым альбоме, калі ў выкананні гурта прагучала прэм'ера песні «Мар'я».

Завяршальны этап фэсту «Камяніца» выпаў на долю музыкантаў «Палаца» і яго кіраўніка Алега Хаменкі. Многія з прысутных бачылі, як Алег хваляваўся наконт таго, як пройдзе гэты музычны марафон. Ці не падвядзе надвор'е і апаратура, ці ў свой час пад'едуць музыканты, ці будзе ў фэсту дастаткова наведвальнікаў. Але арганізацыйныя пытанні не засланілі ў Алегу артыста, які ў складзе «Палаца» «выкладаўся» на ўсе сто адсоткаў! Прыемна было бачыць удзельнікаў гурта ў добрай творчай форме, чуць іх старыя хіты, знаёміцца з новымі аранжыроўкамі і творамі. Вось ужо праўду кажуць: без «Палаца» і «Троіцы» ні адзін фолк-фэст не будзе паўнавартасным. Як і належыць пачынальнікам і грандам айчыннага фолк-мадэрну!

**P.S.** У мінулым годзе, калі адбыўся першы фэст «Камяніца», многія наведвальнікі разважалі пра яго будучыню ў залежнасць ад таго, як будзе арганізавана транспартнае абслугоўванне фестывалю. Гэтым годам усё было пастаўлена лепшым чынам: многія слухачы скарысталіся роварамі, з якімі іх без размоў пусцілі на тэрыторыю музея. Таксама і транспарту было больш. Прынамсі, я і мае сябры хутка дабраліся да сталіцы аўтобусам № 203, як было і анансавана арганізатарамі «Камяніцы». Дзякуем!

ВАНДРОЎКА

# ПАМЕЖНАЯ ЗОНА

Алесь ЛАПО

**Памежжа Магілёўскай і Гомельскай абласцей і расійскай Браншчыны прыняло на сябе канцэнтраваную радыяцыйную дозу, якая мусіла быць распаўсюджана паўночна-ўсходнім ветрам углыб Расіі. Авіяцыя спыніла небяспечныя аблокі, утварыўшы другую па велічыні чарнобыльскую пляміну на сусветнай мапе. Мы з сябрамі вырашылі на роварах здзейсніць падарожжа па зямлі, якая была вымушана прыняць на сябе радыяцыйны ўдар.**



Неглюбскія бабулі

## Беларусь

Пачынаем свой шлях з найбольш радыяцыйна забруджанага беларускага горада — Веткі (Брагін у разлік не бяром: ён мае статус гарадскога пасёлку). Горад узнік напрыканцы XVII стагоддзя і мусіў стаць па задуме стварыўшых яго ўцекачоў-стараабрадцаў галіной, ад якой вырасце дрэва сапраўднай хрысціянскай веры. Не атрымалася: на сёння ад стараверскага горада засталіся толькі музейныя экспанаты. Самі ж праваслаўныя кансерватары ў горадзе калі і ёсць, то вядуць яны вельмі замкнёны лад жыцця.

Веткаўскае насельніцтва жыве пераважна ў драўляных хацінках, вокны і франтоны якіх традыцыйна ўпрыгожаны вытанчанай разьбой. Да радыяцыі жыхары ставяцца спакойна: «Дзе той Чарнобыль, дый калі ён быў?!» Пра бестурботнасць веткаўцаў гаворыць і дасягненне горадам дачарнобыльскай колькасці насельніцтва.

Знішчаныя чарнобыльскім смерчам 58 вёсак гарантавалі Веткаўскаму раёну малапачэснае лідэрства ў Беларусі. Толькі Неглюбскі сельскі савет больш-менш прыдатны да жыцця.

Дарога на Неглюбку — суцэльны лес, уваход і ўезд у які забаронены жахлівымі знакамі з чорна-жоўтай афарбоўкай. Вёска на ўсю Беларусь славіцца ткацтвам: кросны тут маюцца ў кожнай гаспадыні. Некаторыя жанчыны ткалі да 75–80 гадоў, аднак сёння не вытрымліваюць вочы. У вёсцы працуюць два дзіцячых ткацкія гурткі, таму ёсць спадзяванне, што традыцыя захаваецца, а не знікне, як тое сталася з мужчынскім промыслам — вырабам гармонікаў. Набожнае насельніцтва вёскі з асаблівай увагай ставіцца да афармлення чырвоных кутоў у хаце: у кожным пакоі тут знаходзіцца абраз, упрыгожаны стракатымі ручнікамі.

Вёска выключная не толькі рамёствамі і промысламі, аднак і нацыянальным складам: тут пражываюць прадстаўнікі больш як дзесяці народнасцяў. Замежнікаў прываблівае бясплатнае жыллё, праца і магчымасць хутка атрымаць беларускае грамадзянства. На ферме працуюць пераважна казахі, малдаване, азербайджанцы — маладое беларускае насельніцтва даўно з'ехала з гэтага радыяцыйнага аазіса.

Багаты на лес і прыдарожныя знакі радыяцыйнай небяспекі Чачэрскі раён, сярэдняя паказчыкі радыяцыі (па Cs–137) тут вагаюцца паміж 5 і 15 Кі/км². Аднак і тут сустракаюцца досыць вялікія населеныя пункты. Вёска Палессе цікавая мініяцюрнай праваслаўнай царквой і абурэннем мясцовых жыхароў, чаму вакол зашкальвае радыяцыя, а іх сяло лічыцца цалкам чыстай зонай.

Чарнобыльскі след у Краснапольскім раёне яшчэ глыбейшы, чым на Чачэршчыне, аднак дзіва — радыяцыйных знакаў тут амаль няма. Яшчэ добра, што землі тут не заходзяць. Траса Краснаполле—Касцюковічы — зона адсялення (радыяцыя тут сягае за 15 Кі/км2). Закінутыя землі пакідаюць змрочнае ўражанне. Амаль усе прыдарожныя вёскі даўно пахаваныя, што дагэтуль ігнаруюць дарожныя паказальнікі і мапы. Сярод такіх паселішчаў-зданяў — Савінічы, аднак дзіва — па другі бок ад пахаванай вёскі пасвіцца калгасны маладняк. Пастухоў далейшы лёс мяса-малочнай прадукцыі не хвалюе, больш іх непакоіць пытанне адсутнасці чарнобыльскага дадатку да заработнай платы.

Апошнія гады свайго існавання адлічваюць Самацэвічы, радзіма Аркадзя Куляшова. Вёска амаль дваццаць гадоў таму была выселена, аднак людзі, пераважна старыя, адзін за адным паверталіся. Вёску давялося рэабілітаваць і дазволіць жыццё на забруджанай тэрыторыі. Сёння на вялізнай плошчы былога мястэчка раскіданыя з дзесятак жылых хацін і закінутая царква ў псеўдарускім стылі. Усе кінутыя пабудовы раўнуюць з зямлёй «радонаўцы».

Такі ж лёс мусіў напаткаць памежныя Відуйцы, аднак жыхары не праявілі эміграцкага імпэту. З беларускага боку мяжы ў дваццацікіламетровым радыусе ад іх — бязлюдныя і дзікія абшары. Засяваецца толькі невялікая тэрыторыя вакол вёскі, і тое на паказальніку дазіметраў тут заплюшчваюць вочы — не хочацца пакідаць пустой тую ўрадлівую глебу ў рэгіёне. Вёска жыве: на ферме сушыцца зерне, малыя дзеці гойсаюць у пяску, закіданым лялькамі, да позняга вечара тут бабулі вядуць гамонкі і спяваюць песні на прысядзібных лавах.

Ужо амаль дзесяць гадоў тут базуюцца «радонаўцы», у функцыі якіх уваходзіць хаваць у зямлю ўсё, што засталося ад закінутых чарнобыльскіх вёсак і кантраляваць навакольны фон. Унутраны двор аддзялення спецпрадпрыемства «Радон» упрыгожаны трафеямі знішчаных хацінак — кроснамі, калаўротам, керамічнымі і кавальскімі вырабамі. Праўда, ад размовы работнікі ветліва адмовіліся — відаць, ёсць што хаваць.

## Расія

Там, дзе палявая дарога пераходзіць у выкладзеную з блокаў узлётна-пасадачную паласу былога аэрадрома, пачынаецца Расія. Іншыя паказальнікі дзяржаўнай мяжы тут не прадугледжаны. Памежная вёска Мядзведзі сустракае помнікам Чапаеву і ажыўленымі гандлёвымі шэрагамі, на якіх багата гасцей з Беларусі. Чарнобыльскі статус вёскі не паўплываў на яе насельнасць: выязджаць сталі толькі ў апошнія гады, бо дзяржава пачала даваць істотную кампенсацыю за пакінутыя хаты. Мясцовыя жыхары задаволеныя знаходжаннем па гэты бок мяжы: тут спраўна адлічваюць чарнобыльскія «грабавыя», працэй адкрыць прадпрымальніцкую справу і адсутнічае атмасфера безвыходнасці, характэрная для беларускай зоны.

Раённы цэнтр Красная Гара вядомы тым, што гадоў дзесяць таму прасіўся ў склад Беларусі. За тое было сабрана больш за пяць тысяч подпісаў, аднак справа скончылася толькі звальненнем граданачальніка. Сёння красногорцы на гэту антыдзяржаўную акцыю забыліся: прабеларускіх настрояў тут паменела. Аднапавярховы гарадскі пасёлак аказаўся досыць дагледжаным, аднак працы, як і раней, нестае.

Поўдзень раёна найбольш забруджаны, аднак і тут нідзе не сустрэнеш прыдарожных знакаў радыяцыйнай небяспекі. Пра радыяцыю тут імкнуцца не нагадваць. У вёсках жыхароў становіцца ўсё менш, аднак гэта можна спісаць на натуральны працэс урбанізацыі. У блізкай да беларускай мяжы вёсцы Ялоўка ўбранне жылых пабудоў дапаўняюць разьбой, а гаворка, насуперак запэўніванням мясцовых жыхароў («Не, мова наша ні беларуская, ні руская — дзеравенская»), ужо зусім родная.

У суседнім Увеллі называюць звышнатуральныя лічбы радыяцыі і кажуць, што за трыста метраў адсюль, на балотах, не хапае шкалы дазіметру, каб яе замерыць. Аднак вёска напалову заселеная, людзі трымаюць гаспадарку і з аптымізмам глядзяць у будучыню. Грашовы чыннік займае не апошняе месца: жыхары напоўніцу карыстаюцца чарнобыльскімі даплатамі, кампенсацыямі і льготамі. Пра тых жа, хто адсюль з'ехаў, кажуць, што ўсіх ужо прывезлі і пахавалі на вясковых могілках. Гэтакая квінтэсенцыя чарнобыльскай праблемы ў Расіі — смерць з набітымі кішэнямі і ўсмешкай на вуснах.

Чамусьці лепшым з горшых падаецца беларускі падыход: незасеяныя палі, пустыя вёскі са знакамі «Увага, радыяцыя! Уваход і ўезд забаронены!».

Лясной пясчанай дарогай кіруюся дадому — у Беларусь.

## РЭЦЭНЗІЯ

### ДВАЙНІК РАМАНА ПАЛАНСКАГА

**«Прывід» — апошні фільм слыннага рэжысёра — можна ацаніць на 3,5 зоры па пяцізоркавай шкале.**

Людзей, якіх пішуць за іншых кнігі, у нас называюць «літаратурнымі неграмі», а на Захадзе — «прывідамі». Жыццё прывідаў невядомае, уся пашана дастаецца іх героям. Колішні брытанскі прэм'ер Адам Лэнг (Пірс Броснан) наймае такога прывіда, каб той дапісаў ягоную біяграфію. Папярэдні пісьменнік загадкава загінуў.

Герой (зляканы і стрыманы Юэн МакГрэгар) трапляе ў цэнтр палітычных інтрыг і страшных загадак.

У карціне Рамана Паланскага, якой рэжысёр кіраваў з турэмнай камеры, ажываюць шпегаўскія гісторыі ў духу Хічкока і выкрываюцца нягодныя палітычныя гульні. Але стужка, нягледзячы на ўяўную актуальнасць, — адвечны рэжысёрскі сюжэт пра жыхара гета ў варожых абставінах. Гэты месціч, як маленькі Раман, хаваўся ад эсэсаўцаў («Піяніст»), быў героем у вампірскім палацы («Баль вампіраў»), станавіўся ахвяраю паранойі («Жыхар»).

У «Прывідзе» нічога містычнага няма, калі не лічыць несастарэлай рэжысёрскай віртуознасці. Фільм — камерны палітычны трылер, пабудаваны як добры і забыты дэтэктыў. Толькі следчы ў такім дэтэктыве не адрозніваецца ад ахвяры. Толькі за шыбамі — сумна-трымценны дождж, палохае самотная выспа, а разгадка таямніцы каштуе заўжды задорага.

### НЯСТРЫМАНАЯ КЛАСІЧНАЯ ШКОЛА

**Сільвестр Сталонэ зрабіў баявік у духу 1980-х. Сталонэ запрасіў у фільм «Нястрыманыя» і іншых галівудскіх ваяроў. Бадзёрая і «нястрыманая» адзнака стужкі — 3 зорачкі з 5-ці.**

Кампанія наёмнікаў на чале з Барні Росам змагаецца з кепскімі хлопцамі па ўсім свеце. Аднойчы героі атрымліваюць заданне правесці аперацыю ў дыктатарскай краіне. Але адзін ваяр з баявой каманды перайшоў на бок ворага. Барацьба пачынаецца.

Карціна Сільвестра Сталонэ «Нястрыманыя» — вяртанне ў залатыя часы 1980-х, калі кампутарныя эфекты не лезлі ў вочы, героі былі станоўчыя, а нягоднікі атрымлівалі па мордзе па поўнай прагpаме. У фільме ў галоўнай ролі здымаецца ганаровы «Рэмба» — Сталонэ. Запрошаны новыя героі боек: Джэт Лі, алімпійскі ўдзельнік Джэйсан Стэтхэм і — настальгічная радасць — старая гвардыя. У іранічна-сяброўскім эпізодзе з'яўляцца тэрмінатар і губернатар Арнольд Шварцэнэгер, «моцны арэшак» Брус Уіліс. Асобная роля перабежчыка — у Дольфа Лундгрэна.

У кампаніі крутых хлопцаў — і Мікі Рурк, які ў 1980-я гады здымаўся ў аўтарскім кіно ды эратычных стужках. Але па вяртанні на вялікі экран Рурк абзавёўся тварам «Рэстлера», лапшовай фрызурай і жалезнымі фіксамі. У баявой кампаніі — самае тое.

Праверaная каманда — яшчэ даволі бадзёрая. А бойкі без каскадзёраў, жыўцом — гэта вам не кампутарныя фіцюлькі.

**Падрыхтаваў Андрэй Крыніцын**

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

ЗАСНАВАЛЬНІК: Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

ВЫДАВЕЦ: Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

НАДРУКАВАНА ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 876

Падпісана да друку 10.09.2010. 8.00.

Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.